ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



«Раблю тое, у што веру»



У чым сакрэт прафсаюза?



Каманда на колах

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$5 238,9 млн у эквіваленце**

*склалі золатавалютныя рэзервы Беларусі ў адпаведнасці з метадалогіяй Міжнароднага валютнага фонду на 1 чэрвеня. За май 2017 года золатавалютныя рэзервы павялічыліся на $130,2 млн (на 2,5%) пасля росту ў красавіку на $92,6 мільёна. Па выніках студзеня—мая прырост рэзерваў склаў $311,7 млн 6,3%). Павелічэнню золатавалютных рэзерваў у маі спрыялі паступленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам Беларусі аблігацый, наміналаваных у замежнай валюце, купля Нацыянальным банкам замежнай валюты на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», паступленні ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, а таксама павелічэнне кошту манетарнага золата.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8672 | ▼ |
| Еўра | 2,1026 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0712 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

17107

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 107 (28471)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПЕРАПРАВА, ПЕРАПРАВА...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ваеннаслужачыя транспартных войскаў Узброеных Сіл дапамагаюць жыхарам Бешанковіцкага і Шумілінскага раёнаў перасякаць раку Дзвіну. У апошні час рака заметна абмялела, і прыходзіцца рамантаваць наведзены з пачатку навігацыі пантонны мост.

*(Больш здымкаў глядзіце на сайце «Звязды».)*

■ Бізнес

## Гульня па правілах

### Прадпрымальнік з Радуні гатовы пашырыць вытворчасць на пустуючых плошчах

**На ўскрайку гарадскога пасёлка Радунь, што ў Воранаўскім раёне, не адно дзесяцігоддзе пустуе былая база перасоўнай механізаванай калоны. Малады бізнесмен Андрэй МАСЕЛЬ частку памяшканняў арандуе пад вытворчасць драўніны і шынамантаж. Але большасць плошчаў так і стаяць незанятыя.**

СТАР. 4



■ Камандзіроўка па пісьме

## АД ЗМЯРКАННЯ ДА ДОСВІТКУ

### Ці будуць у вёсках уключаць ноччу ліхтары?

**У сельскай мясцовасці пачалі адключаць начное святло на вуліцах на летні перыяд. Прычына — эканомія бюджэту. Але ў саміх вяскоўцаў такія меры часам выклікаюць абурэнне. Прынамсі, да нас у рэдакцыю па гэтым пытанні звяртаюцца не ўпершыню. Вось і нядаўна — зноў пісьмо. Гэтым разам з аграгарадка Зембін Барысаўскага раёна.**

«З 1 красавіка ў нашым Зембіне (як потым высветлілася, і ў вёсках па ўсім раёне) адключылі начное асвятленне вуліц. Зроблена гэта было па рашэнні сельскага Савета дэпутатаў. Ніхто не спрачаецца: разумная эканомія не пашкодзіць ніколі, але чаму хадзіць навобмацак павінны жыхары вёскі?» — піша нам чытач Андрэй Міколінскі.

Ужо пры сустрэчы мужчына расказвае: нядаўна ў аграгарадку бяда здарылася. Нехта ўночы запускаў вялізны кітайскі ліхтарык у паветра і зачапіў ім буслінае гняздо. Гняздо згарэла, птушкі засталіся без дому, а вінаватых не апазналі: жанчына, што жыве ў доме непадалёк і стала сведкай здарэння, без святла твараў не разгледзела. (А ўявіце, што гэтак жа неапазнана хтосьці можа ўлезці ў чужы хлеў ці гараж і вынесці гаспадарскае дабро.)

Уключаных ліхтароў на вуліцах не хапае людзям працоўным. Настаўніцам прыйдзецца ў поцемках хадзіць на дзяжурства на дыскатэку, камбайнёрам — вяртацца са жніва. «Урачы нашы дзяжураць уночы дома. Адной з іх ужо пад 70. Яна жыве ў адным канцы вёскі, а бальніца знаходзіцца ў іншым. Ёй кіламетры чатыры на выклік ісці — а святла няма! Ці вось даярак у чатыры раніцы аўтобус з цэнтра аграгарадка на работу забірае. У пачатку жніўня ў гэты час цёмна будзе», — дадае Андрэй Міхайлавіч.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## ПА ЎСІХ ВЫМЯРЭННЯХ

### Кіраўнік дзяржавы наведае сталіцу Казахстана

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8—9 чэрвеня здзейсніць рабочы візіт у Казахстан, дзе бярэ ўдзел у пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, паведаміла прэс-служба беларускага лідара.**

У сваім выступленні на саміце кіраўнік дзяржавы агучыць пазіцыю беларускага боку па пытаннях далейшага развіцця арганізацыі, у тым ліку яе эканамічнага вымярэння. Беларусь у якасці назіральніка ў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва прымае актыўны ўдзел у шырокім коле мерапрыемстваў па ўсіх асноўных вымярэннях: палітыка-дыпламатычным, гандлёва-эканамічным і культурна-гуманітарным.

Аляксандр Лукашэнка таксама возьме ўдзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «ЭКСПА-2017» у Астане, дзе прадстаўлены і беларускі павільён. Афіцыйна свой удзел у выстаўцы пацвердзілі больш за 110 краін і каля 20 міжнародных арганізацый. Акрамя таго, запланавана двухбаковая сустрэча беларускага лідара з Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым. Кіраўнікі дзяржаў абмяркуюць парадак дня беларуска-казахстанскіх адносін, узаемадзеянне ў інтэграцыйных фарматах.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## КАБ ПАЧУЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

**Разбірацца ў камунальных, жыллёвых, дарожных і іншых набалелых пытаннях 10 чэрвеня будуць прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі справамі. Патэлефанаваць чыноўнікам можна з 9 раніцы да 12 гадзін. Нагадаем, гарачыя лініі працуюць кожную суботу.**

**Брэсцкі аблвыканкам**
НАРКЕВІЧ Юрый Іосіфавіч — кіраўнік справамі (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам**
ГРАБНЁЎ Генадзь Іванавіч — першы намеснік старшыні (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам**
КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна — кіраўнік справамі (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам**
БУБЕНЧЫК Алена Аляксандраўна — намеснік старшыні (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам**
ЧЫКІДА Алег Іванавіч — першы намеснік старшыні (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам**
ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч — старшыня Савета дэпутатаў (5004160);
**Мінскі гарвыканкам**
ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч — намеснік старшыні (2224444).

■ Знешняя палітыка

# СУСЕДЗЯЎ НЕ ВЫБІРАЮЦЬ

**У Міністэрства замежных спраў Беларусі быў выкліканы пасол Літвы Андрус Пулакас — у сувязі з выказваннямі Прэзідэнта Літоўскай Рэспублікі Далі Грыбаўскайтэ.**

«Падчас сустрэчы беларускі бок запатрабаваў тлумачэнняў у сувязі з абвінавачаннямі Беларусі ў пагрозе для краін Балтыі і Польшчы, якія прагучалі з вуснаў кіраўніка літоўскай дзяржавы, — гаворыцца ў паведамленні на сайце знешнепалітычнага ведамства. — Асабліва было адзначана, што выкарыстаная Прэзідэнтам Літвы лексіка, уключаючы словы «агрэсіўныя гульні», з'яўляецца абразай для нашай краіны, якая вядзе міралюбівую палітыку, робіць рэальны і актуальнапрызнаны ўнёсак у справу ўмацавання бяспекі нашага рэгіёна». На думку МЗС, такія заявы робяцца не для ўмацавання стабільнасці ў рэгіёне, а каб павысіць сваю пазнавальнасць сярод партнёраў па НАТА і папулярнасць у выбаршчыкаў.

«Вельмі дзіўна, што падобная рыторыка гучыць з вуснаў Прэзідэнта краіны, дружалюбныя адносіны з якой замацаваныя беларуска-літоўскім «Дагаворам аб добрасуседстве і супрацоўніцтве», які падпісаны і дзейнічае ўжо больш за 20 гадоў, — адзначаецца ў паведамленні на сайце МЗС. — Увага пасла Літвы была асабліва звернута на тое, што ключавое слова ў гэтым дагаворы — добрасуседства, бо суседзяў, як вядома, не выбіраюць — іх дае Бог».

У панядзелак, пятага чэрвеня, Прэзідэнт Літвы Даля Грыбаўскайтэ назвала «выклікам і пагрозай» для рэгіёна суседства з Расіяй і Беларуссю ў інтэрв'ю тэлекампаніі LRT, якое яна давала напярэдадні афіцыйнага візіту ў Эстонію. «Эстонія, як і Латвія, а таксама Польшча для нас вельмі важныя, паколькі гэта ўсходняя мяжа НАТА, таму выклікі і пагрозы — тыя ж. Гэта — знаходжанне Расіі і Беларусі каля нашых усходніх меж. Вядома, гэта і мілітарызацыя, якую мы назіраем у Калінінградзе, выкарыстанне тэрыторыі Беларусі для розных эксперыментаў і агрэсіўных гульняў, накіраваных супраць Захаду. Сярод іх — і маркаваныя вайсковыя вучэнні», — заявіла Даля Грыбаўскайтэ.

Учора наконт сітуацыі, якая склалася, выказаўся і міністр замежных спраў Літвы Лінас Лінкявічус. «Мы заўсёды памятаем пра тое, што гэта наш сусед, што мы з гэтым суседам і гандлюем, і супрацоўнічаем, і партнёрства ў гэтым сэнсе вельмі важнае, — заявіў кіраўнік МЗС Літвы пра Беларусь. — Аднак ёсць аспекты, якія заслугоўваюць каментарыяў. Мы не можам не звяртаць увагі на гэта».

Трэба сказаць, так званыя агрэсіўныя гульні — гэта традыцыйныя вучэнні, якія наша краіна сумесна з усходнім суседам праводзіць рэгулярна. Яны ніколі не неслі агрэсіі ніводнай дзяржаве. Больш за тое, яны праводзяцца адкрыта, і на наступны вучэнні, якія так апасаецца спадарыня Даля Грыбаўскайтэ, — «Захад-2017» — могуць прыехаць і паглядзець прадстаўнікі любой краіны — у тым ліку і Літвы. Пра гэта асабіста заявіў кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падчас Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ў красавіку гэтага года.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Выбухі ў іранскай сталіцы

У маўзалеі імама Хамейні на поўдні Тэгерана адзін за адным прагрымелі два выбухі. Як перадаюць інфармагенцтвы, яшчэ адзін нападнік на маўзалей падарваў сябе.

Раней паведамлялася, што адзін з тых, хто нападаў (па некаторых даных, гэта была жанчына), падарваў сябе на тэрыторыі маўзалея заснавальніка Ірана імама Хамейні, яшчэ дваіх затрымала паліцыя. Акрамя таго, каля будынка маўзалея было знойдзена і абясшкоджана выбуховае прыстасаванне. Паводле папярэдняй інфармацыі, у выніку інцыдэнту загінуў адзін чалавек, пяць атрымалі раненні. Таксама ўчора група ўзброеных людзей адкрыла страляніну ў будынку іранскага парламента. Вядома, што ў выніку здарэння там загінуў сем чалавек. Усяго ж у выніку гэтых тэрактаў загінулі 12 чалавек. Паводле апошняй інфармацыі, адзін з тых, хто нападаў на будынак парламента, які быў акружаны службай бяспекі, таксама падарваў сябе. Іранскае інфармагенцтва FARS паведаміла, што адказнасць за нападзенне на парламент і маўзалей у Іране ўзяла на сябе тэрарыстычная групоўка Ісламская дзяржава.

### Катар вядзе перагаворы з Турцыяй і Іранам аб атрыманні харчавання і вады

Збожжавых запасаў на рынку краіны засталося на чатыры тыдні. Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters са спасылкай на прадстаўніка ўлад Катара.

«Мы вядзём перагаворы з Турцыяй, Іранам і іншымі краінамі», — заявіў чыноўнік агенцтву. Акрамя таго, ён дадаў, што дастаўка будзе ажыццяўляцца пры дапамозе грузавых рэйсаў катарскай авіякампаніі Qatar Airways.

Нагадаем, што ў панядзелак Бахрэйн, ААЭ, Сірыя, Егіпет, Емен, часовы ўрад Лівіі, Мальдыўская Рэспубліка і Рэспубліка Маўрыкій абвясцілі аб разрыве дыпламатычных адносін з Катарам з-за «падтрымкі эміратам тэрарызму і экстрэмісцкай ідэалогіі». У аўторак да іх далучылася Маўрытанія. Шэраг краін заявілі аб прыняцці серыі мер, у тым ліку спыненні марскіх і авіязносін, прыпыненні банкаўскіх аперацый, высылцы дыпламатаў і грамадзян Катара.

Улады апошняга назвалі гэтыя дзеянні неапраўданымі, а абвінавачанні ў свой адрас — беспадстаўнымі.

### У ЗША паўлін залез у краму са спіртным і разбіў бутэлек на сотні долараў



Уладальнік крамы спіртнога ў амерыканскім горадзе Аркадзія (штат Каліфорнія), непадалёк ад Лос-Анджэлеса, панёс страты ў сотні долараў з-за самкі паўліна, якая заблукала ў гандлёвую ўстанову. Крылатая «пакупніца», зразумела, нічога не набыла, але затое перабіла частку тавару на кругленькую суму, паведамляе AP.

Менеджар крамы расказаў журналістам, што не адразу заўважыў птушку. Тады ён выклікаў спецыяліста са службы кантролю за жывёламі, які спачатку паспрабаваў асцярожна выправадзіць нязваную госцю з крамы, штурхаючы яе сачком.

Калі гэта яму не ўдалося, служачы вырашыў злавіць птушку, аднак тая так перапалохалася, што прынялася скакаць па паліцах і махаць крыламі. У выніку ёй удалося разбіць нямала бутэлек з разнастайным алкаголем, якія літаральна разляталіся ў розныя бакі.

Уладальнікі крамы пры гэтым заставалася толькі назіраць за разгромам і здымаць тое, што адбывалася, на відэа.

■ Меркаванне



# ШАС: пляцоўка магчымасцяў

**Саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС) адкрываецца 8 чэрвеня ў Астане. Што мы ведаем пра гэтую арганізацыю, якія магчымасці яна дае для Беларусі, як можа змяніцца свет з-за дзейнасці гэтай арганізацыі?**

Перш за ўсё, XXI стагоддзе мае ў якасці аднаго з трэндаў усё большае ўзмацненне ўплыву недзяржаўных суб'ектаў на міжнароднай арэне. І міжнародныя арганізацыі, у тым ліку такія, як ШАС, з'яўляюцца іх важнай часткай. Таму для Беларусі важна быць у гэтым трэндзе — усяляк развіваць адносіны з міжнароднымі арганізацыямі, рабіць так, каб у іх ведалі пра нашы нацыянальныя інтарэсы і мы маглі ўплываць на прыняцце найважнейшых рашэнняў, якія закранаюць Беларусь. Тым больш што ШАС з'яўляецца арганізацыяй, у якой на Беларусь глядзяць вельмі добразычліва. Уплыў яе на сусветныя працэсы будзе ўзрастаць з кожным годам, паколькі членамі ШАС з'яўляюцца вельмі ўплывовыя краіны.

Сёлета ў лютым мы прынялі вельмі важнае рашэнне аб бязвізавым уездзе на пяць дзён для жыхароў 80 краін свету, а ў маі — аб трыццацідзённым бязвізавым уездзе для грамадзян Кітая. Добры імідж становіцца ўсё больш важным фактарам для паспяховага развіцця эканомікі. Калі ў краіны спрыяльны імідж, у яе едзе ўсё больш бізнесменаў і турыстаў, актыўна прыцягваюцца інвестыцыі, ствараюцца новыя працоўныя месцы. Пры дрэнным іміджы пра гэта даводзіцца забыцца. І міжнародныя арганізацыі з'яўляюцца адной з самых галоўных пляцовак для фарміравання меркавання пра краіну. Таму ў іх нам вельмі важна пастаянна ствараць станоўчы вобраз Беларусі. Нягледзячы на тое, што ШАС — яшчэ вельмі маладая арганізацыя (пачала фарміравацца ў 2001 годзе), яна ўжо ўплывае на імідж краін, якія ўдзельнічаюць у яе дзейнасці.

Не будзем забываць і пра тое, што ўдзел Беларусі ў арганізацыі, членамі якой з'яўляюцца 40 працэнтаў насельніцтва Зямлі, з'яўляецца выгадным для бізнесу. У мерапрыемствах ШАС у складзе дэлегацый удзельнічаюць вельмі ўплывовыя чыноўнікі і бізнесмены. Сустракаючыся на палях мерапрыемстваў з членамі беларускай дэлегацыі, многія з іх упершыню даведваюцца пра магчымасці інвеставаць у Беларусь або весці з ёй гандаль. Рост колькасці ўдзельнікаў і назіральнікаў, а таксама краін-партнёраў дабратворна адбіваецца на такіх магчымасцях для нашай краіны. Гэта вельмі перспектыўныя рынкі, але неабходна ўлічваць іх спецыфіку і наладжваць даможленасці на найвышэйшым узроўні.

Саміт у Астане стане, без перабольшання, эпахальным. На ім чакаецца прыём у паўнапраўныя члены двух назіральнікаў — Індыі і Пакістана. Несумненна, Захад устрывожыць той факт, што пасля гэтага ШАС аб'яднае ў сваім складзе адразу чатыры незаходнія дзяржавы, якія маюць вялікі арсенал ядзернай зброі. Галоўным матывам для прыняцця стала павелічэнне фармальнай важкасці арганізацыі. Пасля прыняцця колькасць жыхароў краін, якія ўваходзяць у ШАС, павялічыцца адразу больш чым на мільярд чатырыста мільёнаў, а тэрыторыя — на чатыры мільёны квадратных кіламетраў. Генеральны сакратар ШАС Р. Алімаў, выступаючы нядаўна на XXI Пецярбургскім міжнародным эканамічным форуме, таксама адзначыў, што пасля ўступлення ў ШАС Індыі і Пакістана Арганізацыя з рэгіянальнага форуму, сфакусаванага пераважна на Цэнтральнай Азіі, пяройдзе ў новую якасць і, па сутнасці, ператворыцца ў трансканцінентальную арганізацыю з арэалам адказнасці ад Арктыкі да Індыйскага акіяна з Поўначы на Поўдзень і ад кітайскага Льян'юнгана да расійскага Калінінграда з Усходу на Захад.

Немалаважным матывам стала і жаданне асобных членаў арганізацыі ўраўнаважыць дамінаванне Кітая ў арганізацыі па такіх параметрах, як памер насельніцтва і эканомікі. Непазбежным адмоўным бокам будзе факт сур'ёзных супярэчнасцей, што існуюць як паміж Індыяй і Пакістанам (якія фактычна знаходзяцца на мяжы вайны і нават свае ядзерныя арсеналы стварылі менавіта па гэтай прычыне), так і паміж гэтымі краінамі і ўжо наяўнымі ўдзельнікамі. Так, не сакрэт, што ЗША актыўна імкнецца выкарыстоўваць Індыю ў якасці азіяцкай процівагі ўплыву Кітая ў рэгіёне і што індыйскае кіраўніцтва ў цэлым дастаткова добразычліва ставіцца да амерыканскіх авансаў. Дастаткова згадаць, што ў нядаўнім саміце «Паясы і шляхі» ў Кітаі індыйскае кіраўніцтва дэманстратыўна адмовілася ўдзельнічаць. У той жа час Пакістан з'яўляецца найбліжэйшым саюзнікам Пекіна, што нервуе індыйскае кіраўніцтва.

Немалаважным момантам у дзейнасці ШАС з'яўляецца і праца адной з дзвюх пастаянных структур арганізацыі — Выканкама Рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры (РАТС). На фоне рэзкага росту тэрарызму ўжо не толькі ў Азіі або Афрыцы, але і ў Еўропе, значнасць і запатрабаванасць такога органа відавочная.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Грышку Анатолію Георгіевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Пяткевіч Наталлі Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ Працяг тэмы

# ЗЛАЧЫНСТВА І ПАКАРАННЕ



**Дзяржабвінавачанне запытала найвышэйшую меру пакарання для двух «чорных рыэлтараў» і яшчэ для двух — болей чым па 20 гадоў турэмнага зняволення.**

Для таго каб пералічыць у судзе ўсе тыя злачынствы, што здзейснілі абвінавачаныя, **пракурору аддзела Генеральнай пракуратуры Юрыю ШАРСТНЁВУ і старшаму пракурору аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Аляксандру РАМАНАВУ** спатрэбілася два дні. Нагадаем, што два гады таму ў Магілёве былі затрыманы сужэнцы Ігар і Таццяна Гершанковы, Сямён Беражны і Барыс Калеснікаў па падазрэнні ў незаконным рыэлтарстве і забойстве людзей. На іх рахунку шэсць загубленых жыццяў, яшчэ тром чалавекам цудам удалося пазбегнуць смерці ад іх рук. Змоўшчыкі дзейнічалі па адной і той жа схеме. Знаходзілі ахвяру сярод кватэрных даўжнікоў, прапаноўвалі дапамогу па пагашэнні запазычанасці, потым угаворвалі прадаць нерухомасць, каб вярнуць ім доўг, а на астатнія грошы купіць сабе жыллё. Але як толькі чалавек атрымліваў на рукі грошы, яго везлі на могілкі, дзе загадзя ўжо была падрыхтавана магіла. Перад тым як адправіць небараку ў яму, яны апойвалі яго гарэлкай з клафілінам. І нават не чакалі, калі ахвяра памрэ. Скручвалі скотчам рукі і ногі, а часам яшчэ галаву і грудзіну, і закопвалі.

Псіхалагічна падсудныя былі гатовыя да самага горшага. Усе яны маладыя людзі, ва ўзросце ад 31 да 36 гадоў. На выхаванні сужэнцаў Гершанковых два непаўнагадовыя дзіцяці. Гершанковы-старэйшыя, безумоўна, вар'яты, але нават далёкаму ад справы чалавеку становіцца не па сабе, калі гучыць запыт аб выключнай меры пакарання. Калі пракурор Юрый Шарстнёў пачаў пералічваць грахі падсудных і запытаў пакаранне, Таццяна, якой пагражае 24 гады турмы, не змагла стрымаць слёз. Яе муж, для якога пракурор запытаў найвышэйшую меру пакарання, нават не паварушыўся, але відаць было, як сталі торгацца яго шчокі. Барысу Калеснікаву пракурор запытаў 22 гады і 1 месяц турмы. Наколькі гэта яго кранула, цяжка сказаць. Ён як сядзеў з апушчаным долу тварам, так і застаўся сядзець. І толькі Сямёна Беражнага, якому таксама запыталі «вышку», спакойна сядзеў нага за нагу, быццам нічога і не адбылося. Толькі пераклаў з рукі ў руку нейкую пацёртую кніжку.

Сярод тых, хто прысутнічаў пры гэтым у судовай зале, былі пацярпелыя і родныя пацярпелых. Віктару Яфрэменку цудам пашчасціла пазбегнуць горкай долі.

— У мяне была вялікая запазычанасць за кватэру, — расказаў ён карэспандэнту «Звязды». — Адночы, калі я ішоў дадому, да мяне падбег нейкі малады чалавек, які прадставіўся судовым выканаўцам, і сярдзіта папракнуў: маўляў, колькі я цябе буду шукаць? Сказаў, што ўжо ёсць пастанова на высяленне і ў мяне ёсць толькі месяц на пошукі грошай. Насцярожыла, што замест пастановы ён мне паказаў газету, дзе нешта было падкрэслена. І працягнуў паперку без пячаткі, якую запатрабаваў падпісаць. Сказаў, што, калі праз месяц не заплачу, мяне высяляць. Як потым высветлілася, за судовага выканаўцу сябе выдаваў Сямён Беражны.

З таго моманту ў адзінокага пенсіянера закончылася спакойнае жыццё. Хутка ён пазнаёміўся з Гершанковым і астатнімі ўдзельнікамі гэтай кампаніі. Яны выдавалі сябе за дабрадзеяў. Нават далі грошы, каб мужчына пагасіў доўг. Потым сталі падшукваць яму варыянты для абмену. Але ўласніка кватэры пачала ўжо турбаваць гэтая надакучлівасць. І ён адмаўляўся ад усіх варыянтаў. Пасля чарговай няўдалай здзелкі дабрадзеі страцілі цярпенне і пачалі яму пагражаць. Завезлі ў лес для размовы і нават больш за два тыдні трымалі пад замком. У рэшце рэшт небараку выратавала яго знаёмая. Яна купіла ў яго кватэру, а грошы паклала яму на рахунак. Мужчына зняў роўна столькі, колькі яму трэба было вярнуць гэтым людзям.

Яфрэменка цалкам падтрымаў тое пакаранне, якое запыталі дзяржабвінаваўцы. Ён упэўнены: такім людзям не месца ў грамадстве. З ім згодны і ўсе тыя пацярпелыя ад дзеянняў псеўдарыэлтараў людзі, якія прысутнічалі ў зале. Але канчатковая кропка ў гэтай справе будзе пастаўлена крыху пазней. Яшчэ суд заслухае меркаванні астатніх пацярпелых і абаронцаў. Потым абвінавачаным будзе дадзена апошняе слова, і толькі пасля гэтага суд вынесе сваё канчатковае рашэнне. Газета будзе працягваць сачыць за развіццём гэтай справы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Запрашальнік

# ПАД НЕБАМ ВІЦЕБСКА

**З 10 па 18 ліпеня пройдзе XXVI Міжнародны фестываль мастацтва «Славянскі базар у Віцебску». Гэта пляцоўка для самых розных праектаў, і сёлета іх будзе больш за 100. Канцэрты вядомых выканаўцаў, тэатральныя пастаноўкі, выступленні маладых артыстаў — гэта толькі частка таго, што можна будзе ўбачыць у Віцебску.**

На сольныя канцэрты зорак расійскай эстрады білеты ўжо хутка будуць распрададзены — гэта выступленні Зары, Грыгорыя Лепса, Стаса Міхайлава, Валерыя Меладзэ, Ягора Крыда, гуртоў «Руки вверх» і «Сплин». Адбудзецца адмысловы канцэрт «Вітае Украіна». Там выступяць каля дзесяці ўкраінскіх спевакоў — як народных артыстаў, так і маладых выканаўцаў.

— Завершаны адбор удзельнікаў для міжнароднага конкурсу, — адзначыў **дырэктар фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» Аляксандр СІДАРЭНКА.** — Сёлета прайшло 16 папярэдніх канцэртаў у розных краінах. Упершыню адбыўся адборачны тур на Мальце. Напрыклад, у латвійскай Рызе для ўдзелу паступіла каля 200 заявак. Старшынёй журы дзіцячага конкурсу будзе расійская спявачка Варвара, а старшынёй журы вакальнага конкурсу для дарослых — Адамка Хрыстава, вядомая балгарская выканаўца.

Пройдзе і каля дзесяці тэатральных пастановак. Як адзначае Аляксандр Сідарэнка, трапіць на іх досыць складана, бо білеты імкліва распрадаюцца. Больш шанцаў паглядзець тыя п'есы, што будуць ісці не ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа, а на сцэне канцэртнай залы «Віцебск».

Цікава будзе ўбачыць і «Лялечны квартал». У фестывальнай праграме спектаклі для дзяцей і дарослых прадставяць Беларускі тэатр «Лялька», Гродзенскі тэатр лялек, а таксама лялечныя тэатры з Расіі, Украіны і Швецыі.

З 14 па 16 ліпеня на вуліцах і плошчах Віцебска разгорнецца III Фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». У яго межах адбудуцца інтэрактыўныя праекты вулічных тэатраў, музыкаў, перформераў, паэтаў, лялечных тэатраў і артыстаў.

Як адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара «Цэнтра культуры «Віцебск» Марына РАМАНОЎСКАЯ,** урачыстае адкрыццё фестывалю будзе надзвычай святочным. Яно пройдзе з удзелам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Менавіта з яго рук атрымае ўзнагароду пераможца дзіцячага вакальнага конкурсу. Падчас пралога прагучаць яскравыя прывітанні ад розных краін.

Увогуле ж інтэрнацыянальная праграма фестывалю будзе надзвычай багатай. Іераманах Фоцій — рэгент хора Свята-Пафнуцьеўскага Бароўскага манастыра, пераможца тэлевізійнага праекта «Голас», выканае старадаўнія рускія рамансы, а таксама сучасныя эстрадныя песні. Грузінскі ансамбль «Аліла», які ўжо скарыў гледачоў Еўропы і Азіі сваёй запальнай энергіяй, выканае грузінскія народныя песні і творы сучасных кампазітараў. Ансамбль танца «Алан», што прадстаўляе Паўночную Асецію — Аланію, — пакажа своеасаблівыя танцавальныя навелы, якія раскажуць пра гісторыю Каўказа ў суправаджэнні аркестра народных інструментаў...

Наш ансамбль «Сябры» і Анатоль Ярмоленка дадуць асобны канцэрт у рамках Дня Саюзнай дзяржавы. А вось Дзмітрыя Калдуна, Руслана Аляхно, Ядвігу Паплаўскую можна будзе пачуць толькі з асобнымі кампазіцыямі. Падаецца, прадстаўніцтва беларускай музыкі на такім маштабным фестывалі магло б быць большым...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Класныя навіны

## Для каго праезд застанецца бясплатным?

**Мінскі метрапалітэн растлумачыў парадак праезду школьнікаў і выпускнікоў у летні перыяд.**

Па-ранейшаму права бясплатнага праезду ў метро (і наземным пасажырскім транспарце) надаецца навучэнцам або выхаванцам устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі горада на падставе электроннай карты навучэнца або даведкі з бягучым тэрмінам дзеяння. У сувязі з заканчэннем навучальнага года гэтыя дакументы патрабуюць абнаўлення.

Акрамя таго, неабходна абнавіць даведкі для праезду на перыяд з 1 ліпеня да 31 жніўня тым навучэнцам (у тым ліку выпускнікам 9-х класаў), якія ў летні час будуць задзейнічаны ў гарадскіх праграмах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграмах выхавання і аздараўлення, а таксама дзецям і падлеткам, якія прымаюць удзел у буйнамаштабных масавых мерапрыемствах.

Выпускнікі 11-х класаў змогуць карыстацца бясплатным праездам у сталічным пасажырскім транспарце да 11 чэрвеня ўключна (да заканчэння здачы выпускных экзаменаў і іх адлічэння з устаноў адукацыі).

Варта нагадаць таксама, што пастановай Міністэрства адукацыі нядаўна была зацверджана новая форма даведкі, якая дае школьнікам права бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце, а таксама правілы рэгістрацыі такіх даведак. Цяпер у школьнай даведцы, акрамя інфармацыі пра месца жыхарства яе ўладальніка, у ніжнім левым куце даведкі павінен быць уклеены яшчэ і фотаздымак навучэнца памерам 40 на 30 мм. Гэта зроблена для таго, каб даведкай не маглі скарыстацца іншыя асобы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Як ёсць

# З алкаголем перабор, з фруктамі недабор

**Упершыню ў краіне ацанілі распаўсюджанасць фактараў рызыкі неінфекцыйных захворванняў па метадалогіі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Удзельнікамі STEPS («Крокі») сталі каля 6 тысяч беларусаў ва ўзросце 18—69 гадоў з усіх рэгіёнаў.**

У межах даследавання STEPS пакрокава вызначалася распаўсюджанасць асноўных паводзінскіх і біялагічных фактараў рызыкі неінфекцыйных захворванняў сярод дарослага насельніцтва — ужыванне тытуню і алкаголю, гіпадынамія, нездаровае харчаванне, лішняя вага і атлусценне, павышаны артэрыяльны ціск, павышаны ўзровень глюкозы і ліпідаў у крыві, а таксама сярэдні ўзровень спажывання ў папуляцыі солі і тлушчаў. Неінфекцыйныя захворванні з'яўляюцца асноўнай прычынай смяротнасці ў краінах Еўрапейскага рэгіёна СААЗ, у тым ліку ў Беларусі.

Усе ўдзельнікі даследавання былі падзелены на некалькі ўзроставых груп, абавязковай умовай было асобнае даследаванне гарадскога і сельскага насельніцтва. Усе звесткі пазначаліся і апрацоўваліся электронным спосабам. Кожны апытаны даваў згоду як на дачу адказаў падчас анкетавання, так і на правядзенне вымярэнняў росту і вагі, правядзенне біяхімічнага даследавання.

Як паказала STEPS, 13 працэнтаў 40—69-гадовых маюць больш як 30-працэнтную рызыку развіцця захворванняў сістэмы кровазвароту. Агульныя фактары рызыкі для развіцця кардыялагічных і анкалагічных захворванняў, цукровага дыябету ў нашай папуляцыі маюць высокую распаўсюджанасць: 27 працэнтаў дарослых ва ўзросце ад 18 да 69 гадоў штодня кураць; 53 працэнты ўжывалі алкаголь на працягу апошняга месяца; 73 працэнты ўжываюць менш за пяць порцый фруктаў/агародніны на дзень; 60 працэнтаў маюць лішнюю вагу; 25 працэнтаў — атлусценне; 45 працэнтаў — павышаны артэрыяльны ціск.

Паводле слоў **прадстаўніка СААЗ у Беларусі Батыра БЕРДЫКЛЫЧАВА,** удалося атрымаць вельмі каштоўную і якасную інфармацыю для паспяховай падрыхтоўкі адпаведных праграм па кантролі за неінфекцыйнымі захворваннямі, больш эфектыўнага планавання мерапрыемстваў па прафілактыцы і барацьбе з імі. Вынікі будуць улічаны пры рэалізацыі мерапрыемстваў дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека ў Рэспубліцы Беларусь» на 2016—2020 гады.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Небяспека

## СМЯРОТНАЯ ЗНАХОДКА

**Увечары 6 чэрвеня выбух міны абарваў жыццё мужчыны ў Калінкавічах. Знойдзеныя на месцы фрагменты выбуховай прылады даюць падставу меркаваць, што боепрыпас быў часоў Вялікай Айчыннай вайны.**



Па папярэдніх даных, магчыма, мужчына спрабаваў разабраць ці выпіліць з міны выбухоўку. Следчы камітэт праводзіць праверку па факце смерці.

УУС Гомельскага аблвыканкама нагадвае, што любыя дзеянні з боепрыпасамі небяспечныя для жыцця. Пра такія знаходкі неабходна тэрмінова паведаміць у найбліжэйшае аддзяленне міліцыі.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

## Рэха вайны і не толькі

**У Лепелі ў мясцовага жыхара праваахоўнікі выявілі і канфіскавалі дзве гранаты РГД-5, а таксама малакаліберную вінтоўку ТОЗ-8 і 2249 патронаў рознага калібру, паведамілі ў Міністэрстве ўнутраных спраў.**

Заведзена крымінальная справа за незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў. Па такім жа артыкуле давядзецца адказваць непрацуючаму, раней судзімаму за крадзеж жыхару Гомеля, у якога супрацоўнікамі АМАП УУС быў выяўлены і канфіскаваны пісталет ТТ 1943 года выпуску.

Пра вайну нагадала і знаходка паблізу аграгарадка Ског Сенненскага раёна. Тут супрацоўнікі ГУБОЗіК МУС у лясным масіве знайшлі 163 мінамётныя міны часоў Вялікай Айчыннай. Боепрыпасы былі абясшкоджаны групай размініравання в/ч 5524.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Гульня па правілах

## Пра бізнес

Мы размаўляем з Андрэем у драўлянай альтанцы пасярэдзіне былой базы ПМК. Некалі тут былі гаражы, майстэрні, кацельная і нават кавярня. Утрымліваць базу ўласніку не пад сілу, вось і стаіць яна без справы, зарастае травой.

На гэта звярнуў увагу малады мясцовы прадпрымальнік. Ён меў уласны млын і ўжо атрымаў у арэнду адно з пустых памяшканняў. Паслуга аказалася запатрабаванай, бо жыхары тут мелі вялікія гаспадаркі. Кажуць, што гадоў 7—8 назад на падворку маглі трымаць да 100 свіней. Але цяпер Радунь, як і большасць населеных пунктаў раёна, апынулася ў зоне рызыкі распаўсюджвання афрыканскай чумы свіней і апошніх тут трымаць нельга. Ад млына Андрэй адмовіўся, але стаў ажыццяўляць сваю новую задумку — аўтасэрвіс.

Легальнага рамонту аўто на той час не было, і Андрэй заняў гэту нішу, атрымаўшы адпаведны сертыфікат. Кажа, што кліентаў хапае, прыязджаюць з усяго наваколля. Так што ў хуткім часе прыйшлося пашырацца. Узяў у арэнду гараж, два гаражныя блокі, былы навес для сельгастэхнікі. Наняў на работу некалькі майстроў.

Андрэй не тоячыся расказвае пра крокі на шляху пабудовы ўласнага бізнесу. І адзначае — не трэба займацца тым, што не можа прынесці прыбытак. Калі гэта не выгадна — варта змяніць кірунак і знайсці тое, што будзе карыстацца попытам. Яго наступным крокам стала апрацоўка драўніны.

— Мае родныя абураюцца, што я ўсе сродкі ўкладваю ў вытворчасць, — кажа ён з усмешкай. — Але ў мяне такі прынцып — спачатку станок, затым тое, што жонка папросіць.

## Пра экспарт

Разам з тым Андрэй не бярэцца сцвярджаць, што прадбачыць эканамічны эфект ад новай справы. Ён хутчэй з тых, хто спачатку нешта набывае, а затым размяркоўвае, што рабіць з вынікам. Так адбылося і з вытворчасцю драўніны. Для гэтых мэт была закуплена піларама і лесавоз. Машыну ўдалося яшчэ без растаможвання набыць за мяжой.

Андрэй заняўся распілоўкай драўніны. Спачатку лес набываў у калгасе, затым заключыў дагавор з лясгасам. Ёсць у яго зараз і вальшчыкі лесу, і пільшчыкі. За некалькі гадоў знайшоў партнёраў за мяжой: у Літве, Польшчы, Латвіі. Ёсць і гадавыя кантракты, і асобныя заяўкі. Напрыклад, у Польшчы з беларускай драўніны робяць скрыні для яблыкаў. Бывае так, што радунскі лес плыве цераз мора ў кантэйнерах, і толькі праз два месяцы трапляе да пакупніка.

**Наша даведка:**

У Гродзенскай вобласці назіраецца рост колькасці індывідуальных прадпрымальнікаў і суб'ектаў гаспадарання. Яшчэ два гады таму складвалася адмоўная эканоміка. Так, у 2015 годзе было мінус 160 юрыдычных асоб, летась толькі мінус 20. Сёлета ствараецца больш, чым ліквідуецца.

— Я лічу, што адгружаць піламатэрыял на экспарт — не зусім правільна, — разважае Андрэй. — Сыравіну трэба перапрацоўваць у сябе. Напрыклад, мы маглі б прадаваць больш дарагую прадукцыю — дошкі для падлогі, вагонку, блок-хаусы. Для гэтай вытворчасці патрэбна іншае абсталяванне. У першую чаргу — сушыльная ўстаноўка. Але на арэндныя плошчы яе не паставіш, бо гэта стацыянарны комплекс, трэба падводзіць электрыку, камунікацыі. Мне на гэта ніхто не дасць дазволу.

Магчыма, у будучым з Радуні будуць адпраўляць на экспарт не толькі сыры лес, але і перапрацаваны. Такі намер у бізнесмена ёсць.

## Пра льготы

Андрэй у гэтым сэнсе рэаліст. Вядома ж, ад ільгот не адмовіцца, але ён ведае правілы гульні і лічыцца з імі. Тым больш што для развіцця прадпрымальніцтва ў сельскай мясцовасці ёсць свае прэферэнцыі: тут значна меншыя падаткі.

— У чым важна падтрымаць бізнес? — ставіць пытанне Андрэй і сам адказвае. — Трэба спрасціць працэдуру атрымання крэдыту. Правяраюць амаль месяц, быццам ты хочаш кагосьці падмануць.

Аднойчы ён паспрабаваў узяць крэдыт на пакупку аўтамабіля, каб вазіць работнікаў у лес. Але пакуль ішлі перамовы з банкам, змяніліся нормы заканадаўства, і самім валіць лес забаранілі, усе работы выконвае цяпер лясгас. Адпала і неабходнасць у транспарце. Андрэй паспрабаваў перанесці крэдытную лінію на набыццё станкоў, але перапрафіляваць крэдыт не ўдалося. Хоць Андрэй больш спадзяецца на сябе, без фінансавай падтрымкі ён не абышоўся — крэдыт спатрэбіўся для пакупкі трактара. Тады прадпрымальніка ўразіў такі парадокс: склады на трактарным заводзе запоўнены, а на пакупку тэхнікі спатрэбіўся амаль месяц.

**Кампетэнтна:**

**Як паведамілі ў Фондзе «Гроднааблмаёмасць», база былой ПМК унесена ў графік па ўключэнні ў гаспадарчы абарот у гэтым годзе. Канкрэтныя тэрміны пакуль невядомыя, бо ўсё залежыць ад таго, калі ўласнік (ААТ «Гроднааблсельбуд») прадаставіць неабходныя дакументы. Трэба падрыхтаваць пашпарты, а гэта не танная працэдура. Плануецца, што база будзе мець некалькі лотаў. Арандатар мае першачарговае права на набыццё аб'ектаў. Таксама ён можа купіць іх па рынparam кошце.**

## Пра аб'екты

Андрэй Масель не супраць таго, каб пашырыць сваю вытворчасць. Магутнасцяў хапае, у штаце яго цяпер каля 20 чалавек. І пытанне аб продажы аб'ектаў быццам бы вырашаецца. Навошта яны будуць пуставаць? Тым больш што ёсць прыклад увядзення іх у абарот.

— Я арандую некалькі гаражоў, будынак, дзе раней была тэхніка. Там зараз стаяць мае трактары, — кажа Андрэй. — Гэтыя аб'екты прыведзены ў належны стан, устаўлены новыя вокны, дзверы, зроблены новы дах. Іншыя будынкі таксама можна адрамантаваць, прывесці іх у парадак.

Можна сказаць, што Андрэй Масель адзіны на ўсю Радунь прадпрымальнік-вытворца. Яго паслугамі карыстаюцца і вяскоўцы, і ўстановы. Нядаўна адсюль вазілі піламатэрыялы для рамонту даху крамы ў суседняй вёсцы. Не было б тут сваёй пілармы, прыйшлося б ехаць у суседні, Лідскі, раён.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

**Андрэй СВІРЫДАЎ, старшыня камітэта эканомікі Гродзенскага аблвыканкама:**

— У вобласці ёсць праграма падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу. З другога квартала адкрыта льготнае крэдытаванне для суб'ектаў прадпрымальніцтва са штатам да ста чалавек, з любым відам дзейнасці. Сродкі будуць выдзяляцца на другое паўгоддзе, агульны фонд — 8 млн рублёў. Прадпрымальнікі, якія маюць бізнес-праекты, могуць атрымаць транш. Дарэчы, сродкі за апошнія тры гады выдзяляюцца ўпершыню.

Таксама мы працуем у рамках грамадска-кансультацыйных саветаў і абмяркоўваем тыя акты, якія прымаюцца для спрашчэння вядзення бізнесу. Далучаем да гэтай справы экспертаў. Што датычыцца арэнды камунальнай маёмасці, мы працуем над тым, каб у заканадаўчым парадку знізіць гэтыя затраты на 10—15%.

**Аляксандр ЧУБРЫК, дырэктар Цэнтра «Даследаванні, прагнозы, маніторынг»:**

— Згодна з аналізам рэгіянальнага развіцця, «жывое» прадпрыемства, якое арыентавана на экспарт, пачынае развівацца і цягнуць за сабой унутраны попыт. Вакол такога «генератара» могуць пачаць ствараецца альбо аднаўляцца іншыя прадпрыемствы малога ці сярэдняга бізнесу.

# АД ЗМЯРКАННЯ ДА ДОСВІТКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Да таго ж летам вяскоўцы любяць на выхадныя ў госці хадзіць, дапазна заседжваюцца. А цяпер што?

— У Барысаве неяк на адной вуліцы адключылі ліхтары. Людзі пачалі абурацца — святло вярнулі. Няўжо мы горшыя за гарадскіх? — крыўдуе суразмоўнік.

Па законе часткова ці цалкам адключаць святло ў начны час на вуліцах і дарогах сельскіх паселішчаў не дазваляецца (гэта вызначана гігіенічнымі патрабаваннямі да ўтрымання тэрыторый населеных пунктаў і арганізацый, зацверджанымі ў 2011 годзе пастановай Міністэрства аховы здароўя №110). Таму эканоміць раённы бюджэт чытач прапануе інакш.

— Зразумела, што поўнасцю адключыць асвятленне вуліц у Барысаве немагчыма, але, калі гэта зрабіць на адну ноч у тыдзень на плошчы і праз адзін ліхтар на некаторых вуліцах, гэта дало б нашмат большы эканамічны эфект. А ў вясковай мясцовасці святло ў будныя дні можна ўключаць, напрыклад, так: з 22.00 да 23.30 і з 4.00 да світання (калі даяркі на працу ідуць), — разважае Андрэй Міхайлавіч.

Пракаментаваць сітуацыю мы папрасілі **старшыню Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў Пятра НАВІЦКАГА.** Ён растлумачыў, што цалкам начное асвятленне ў вёсках адключаць не будуць, а сэканомленыя сродкі пойдуць на добраўпарадкаванне раёна.

*— На летні перыяд, калі самыя кароткія ночы, мы пераходзім у рэжым эканоміі. На падставе рашэнняў сельскіх выканкамаў на тэрыторыі раёна было адключана начное вулічнае асвятленне ў сельскіх населеных пунктах. Але ў аграгарадкі яго вернем: толькі зменшым колькасць светлакропак.*



*Заўважу, што гэтыя меры закранулі толькі вулічнае асвятленне. Сацыяльна значныя аб'екты — школа, ФАП, вытворчыя будынкі, ферма — асвятляюцца.*

*Нязручнасцяў для людзей, якія едуць на працу, не будзе. Тая ж дойка пачынаецца ў пяць раніцы (а світае ўжо ў тры) і заканчваецца ў дзевяць вечара.*

*У год на асвятленне з мясцовага бюджэту выдаткоўваецца 5,5 мільярда рублёў старымі грашыма. Толькі ў раёне — гэта 300 сельскіх населеных пунктаў — устаноўлена каля 5,6 тысячы ліхтароў. Улічыце, што ў 114 з гэтых вёсак колькасць падворкаў — ад 1 да 10. Паліць святло ўсю ноч у такіх маланаселеных пунктах немэтазгодна.*

*Сэканомленыя грошы не ляжаць без справы — мы ўкладваем іх у іншыя кірункі. У тым жа Зембіне паставілі жалезабетонныя агароджы. Прыводзім у парадак кінутыя падворкі. Летась у раёне знеслі 94 старыя будынкі, а з пачатку гэтага года — больш за 30. Прыбіраем аварыйныя дрэвы, напрыклад, на сельскіх могілках. Бо калі не знесці, пашкодзяць помнікі — а многія з іх дастаткова дарагія.*

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

*Барысаўскі раён.*


**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО**
**«СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»**

**доводит до сведения акционеров и иных заинтересованных лиц о том, что внеочередным общим собранием акционеров ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ», состоявшимся 07.06.2017, приняты решения:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» за счет средств акционеров путем выпуска дополнительных акций.

2. Об объявлении закрытой подписки на акции ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ».

**Условия проведения закрытой подписки на акции ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» дополнительного выпуска.**

1. Закрытая подписка на акции дополнительного выпуска проводится с целью увеличения оборотных средств Общества.

2. Направление использования средств, полученных в результате подписки, – пополнение оборотных средств Общества.

3. Планируемый объем эмиссии – 1 171 700 (один миллион сто семьдесят одна тысяча семьсот) простых (обыкновенных) акций номинальной стоимостью 0,15 (пятнадцать) копеек, эмиссионная сумма – 175 755 (сто семьдесят пять тысяч семьсот пятьдесят пять) белорусских рублей. Размещение дополнительных акций будет осуществляться в виде записей на счетах.

4. Простые (обыкновенные) акции, выпускаемые в результате закрытой подписки, удостоверяют тот же объем прав их владельцев, что и простые (обыкновенные) акции, выпущенные ранее.

5. Привилегированные акции при проведении данной подписки не размещаются.

6. Планируемый уставный фонд после проведения подписки 193 462,35 (сто девяносто три тысячи четыреста шестьдесят два рубля тридцать пять копеек) белорусских рублей.

7. Цена подписки на одну простую (обыкновенную) акцию – 0,15 (пятнадцать копеек) белорусских рублей.

8. Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям, в том числе и по вновь выпускаемым акциям дополнительного выпуска, определен уставом Общества. Общее собрание акционеров вправе при определении направлений распределения прибыли на период до следующего годового собрания принять решение о направлении ее части (в процентах) на выплату промежуточных дивидендов по итогам полугодия, квартала, месяца. В этом случае по окончании каждого соответствующего периода при наличии прибыли, достаточной для выплаты дивидендов, внеочередным собранием принимается решение об определении размера промежуточных дивидендов в белорусских рублях на одну акцию и срока их выплаты. Общее собрание акционеров устанавливает период, за который выплачиваются дивиденды, а также срок выплаты дивидендов. В случае если решением общего собрания акционеров Общества срок выплаты дивидендов не определен, он не должен превышать 60 дней со дня принятия решения об объявлении и выплате дивидендов. Размер дивиденда объявляется в белорусских рублях на одну акцию. Дивиденды выплачиваются в денежных единицах Республики Беларусь, а по решению общего собрания акционеров и с согласия их получателей – в установленном порядке товаром, ценными бумагами (в том числе акциями Общества, находящимися в его распоряжении, или акциями дополнительного выпуска) или иным имуществом. Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составляется на основании данных того же реестра акционеров, на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, принявшем решение о выплате дивидендов. Информация о времени и месте выплаты дивидендов доводится до сведения акционеров в том же порядке, в котором они извещаются о проведении общего собрания акционеров. По заявлению акционера причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в банке. Расходы по пересылке (перечислению) дивидендов в пределах Республики Беларусь производятся за счет средств Общества.

9. Зачисление акций на счета «депо» подписчиков производится не позднее 5 (пяти) рабочих дней с момента зачисления дополнительного выпуска акций на счет «депо» эмитента.

10. Отчуждение акций, приобретенных в результате подписки, их владельцами возможно после осуществления государственной регистрации дополнительного выпуска акций и зачисления этих акций на счета «депо» их владельцев в соответствии с действующим законодательством.

11. Подписка проводится в период с 04.07.2017 г. по 31.08.2017 г. включительно с 9.00 до 15.00 (кроме выходных и праздничных дней) по месту нахождения Общества: 220007, г. Минск, ул. Володько, 20, каб. 35; тел. (017) 223 46 15.

12. Порядок проведения закрытой подписки:

12.1.1. закрытая подписка проводится в четыре этапа: первый этап – с 04.07.2017 г. по 07.07.2017 г., второй этап – с 10.07.2017 г. по 28.07.2017 г., третий этап – с 31.07.2017 г. по 18.08.2017 г., четвертый этап – с 24.08.2017 г. по 31.08.2017 г. Количество этапов подписки может быть менее указанного выше, в случае, если по результатам предшествующих этапов акционеры подписались и оплатили весь объем дополнительной эмиссии.

12.1.2. на первом этапе каждый акционер имеет право подписаться на количество акций дополнительного выпуска, пропорционально его доле в уставном фонде Общества.

12.1.3. во втором этапе (в случае если в период осуществления первого этапа подписки не были заключены договоры на всю сумму дополнительного выпуска) имеют право участвовать только те акционеры, которые заключили договоры подписки на первом этапе. При этом каждый из упомянутых акционеров имеет право заключить договоры подписки на следующее количество акций:

$П_2 = (С_э – П_1)*А_1/П_1$, где:

$П_2$ – максимальное количество акций, на которое может подписаться акционер в ходе второго этапа;

$С_э$ – количество акций дополнительной эмиссии;

$П_1$ – общее количество акций, на которое подписались акционеры в ходе первого этапа;

$А_1$ – количество акций, на которое подписался конкретный акционер в ходе первого этапа.

12.1.4. в третьем этапе (в случае если в период осуществления первого и второго этапов подписки не были заключены подписки на всю сумму дополнительного выпуска) могут участвовать только те акционеры, которые заключили договоры подписки на втором этапе. При этом каждый из упомянутых акционеров имеет право заключить договоры подписки на любое количество акций, оставшихся нераспределенными между подписантами в течение первого и второго этапов.

12.1.5. акционеры, заключившие договоры подписки на первом – третьем этапе вносят причитающуюся денежную сумму на расчетный счет Общества в срок не позднее 3 (трех) рабочих дней, считая от даты окончания третьего этапа.

12.1.6. четвертый этап: в случае если акционеры, заключившие договоры подписки на акции дополнительного выпуска, не внесут денежные средства в срок, указанный в п. 4.1.5 настоящих параметров, то акционеры, подписавшиеся на акции на первых трех этапах и своевременно внесшие причитающиеся денежные средства, вправе подписаться на неоплаченное количество акций.

12.1.7. акционеры, заключившие договоры подписки на четвертом этапе, вносят причитающуюся денежную сумму на расчетный счет Общества в срок не позднее 3 (трех) рабочих дней, считая от даты окончания четвертого этапа.

12.2. В случае если по результатам подписки на третьем этапе договоры подписки заключены на количество акций, превышающее планируемый объем эмиссии, то преимущественное право на приобретение акций имеет акционер, ранее других заключивший договор подписки.

12.3. При осуществлении подписки акционеры Общества имеют равные права. В качестве оплаты акций дополнительного выпуска акционеры имеют право вносить денежные средства. Акционеру может быть отказано в заключении договора подписки, если на дату обращения акционера для заключения договора подписки Обществом по заключенным ранее договорам уже набрана сумма объявленной эмиссии.

12.4. Акционеры-юридические лица (их представители) для заключения договоров подписки представляют документ, подтверждающий полномочия на заключение сделок, а также в случаях, установленных действующим законодательством, решение уполномоченного органа о совершении крупной сделки.

12.5. В случае досрочного внесения акционерами по договорам подписки суммы объявленной эмиссии подписка может быть прекращена досрочно.

13. Подписка может быть признана несостоявшейся в случае:

13.1. если в сроки, указанные в п. 12.1.1, не будут заключены договоры подписки на сумму дополнительной эмиссии;

13.2. запрета выпуска акций территориальным органом по ценным бумагам.

14. В случае признания подписки несостоявшейся либо запрета выпуска акций территориальным органом по ценным бумагам Общество обязано в течение 7 (семи) календарных дней от даты принятия такого решения возвратить полученные денежные средства акционерам, принявшим участие в подписке.

УНП 100036332 Управляющий А.Н. Хвесюкович

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
8 ЧЭРВЕНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№11 (15818)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны



## Вольга РОЎНАЯ:

# «Раблю тое, у што веру»

**Яна нарадзілася ў невялікай беларускай вёсцы Залессе Смаргонскага раёна. Калі ў дзяцінстве глядзела канцэрты па тэлевізары, нават падумаць не магла, што знакамітыя выканаўцы — групы «Любэ», «Фабрыка», Валерый Лявонцьеў, Аляксей Глызін, Вікторыя Дайнека, многія беларускія зоркі эстрады — будуць выконваць песні на яе тэксты. Яна змагла зацікавіць сваімі вершамі многіх вядомых кампазітараў і спевакоў. Мая суразмоўніца — паэтка, неаднаразовы лаўрэат музычнай прэміі «Залаты грамафон», расійскіх музычных фестываляў «Песня года» і «Новыя песні пра галоўнае», сябра Расійскага саюза пісьменнікаў Вольга РОЎНАЯ. Мы пазнаёміліся на адной з імпрэзаў у музеі-сядзібе М. К. Агінскага.**

— Мерапрыемства кранула сэрца, — дзеліцца ўражаннямі паэтка. — Некалькі разоў на працягу канцэрта я была блізкая да таго, каб расплакацца: і тады, калі мама танцавала пад маю песню «З днём нараджэння, мама» ў выкананні Вольгі Плотнікавай; і калі мае школьныя настаўнікі выйшлі павіншаваць і сказаць цёплыя словы. Я адчула, што людзі любяць мяне і ганарацца мною. Вялікі дзякуй усім, хто прыйшоў!

***— Як вы думаеце, ці паўплывала на вашу будучыню тое, што вы нарадзіліся ў такім гістарычным месцы?***

— Безумоўна. Калі я вучылася ў школе, мы кожны год рыхтавалі тэатральна-музычныя выступленні да дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага. Я некалькі разоў выконвала ролю яго гувернёра — француза Жана Ралея. Магу сказаць, што мелодыі паланэзаў мяне суправаджаюць з дзяцінства і, мяркую, сапраўды паўплывалі на мой унутраны свет. Як і тое, што мая маці ўсё жыццё спявае ў хоры. Музыка акружыла мяне з усіх бакоў. Прыйшлося пісаць да яе словы *(усміхаецца)*.

***— Як пачынаўся ваш творчы шлях?***

— Першы верш быў прысвечаны майму сабаку па мянушцы Шарык, а наступны — кату Люціку. Увогуле, я «прайшлася» па ўсіх любімых хатніх гадаванцах. Тады мне было прыкладна пяць гадоў. У школе наведвала паэтычны гурток. Выходзіла насценгазета, дзе публікаваліся нашы творы. Калі я вучылася ў 8 класе, адпраўляла па пошце свае вершы ў рэдакцыі розных газет. Некаторыя выданні іх апублікавалі, што было вельмі ганарова для мяне і прыемна. Пасля паступлення ў БДПУ імя Максіма Танка рэгулярна публікавалася ва ўніверсітэцкай газеце «Настаўнік» і хадзіла ў паэтычны гурток «Крокі».

***— А што падштурхнула да напісання песень?***

— Іх я ствараю каля 15 гадоў. Пачалося ўсё спантанна: у адзін момант мне прыйшло ў галаву, што можна пісаць не толькі вершы, але і тэксты песень. Сябар надрукаваў мне візітоўкі, на якіх было напісана «паэт-песеннік» і фраза: «Прышываю да музыкі словы». І я са стосам тых візітовак пайшла шукаць кампазітараў і спевакоў у рэальным свеце і на прасторах інтэрнэту.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Абмяркуем

# У ЧЫМ ЯГО САКРЭТ?

## Як прафсаюзу ўдаецца заставацца актуальным для новых пакаленняў

**Забеспячэнне сацыяльных гарантый навучэнскай моладзі, другасная занятасць студэнтаў, арганізацыя адпачынку і аздараўлення, падтрымка студэнцкіх сем'яў, маладых педагогаў, інфармацыйная дзейнасць і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі міжнароднага семінара «Прафсаюз і моладзь — мы разам. Разам — у будучыню!», які сабраў у Мінску кіраўнікоў прафсаюзаў адукацыі і навукі з 17 краін: Балгарыі, Грузіі, Літвы, Украіны, Азербайджана, Арменіі, Бельгіі, Сербіі, Румыніі, Турцыі і іншых... Удзел у яго рабоце прыняла таксама дырэктар Еўрапейскага камітэта прафсаюзаў адукацыі спадарыня С'юзан Флокен.**




Свята «Віват, студэнт БДУ — 2016»

## СТУДЭНТ, ПРАБЛЕМЫ?

Факт, які ўразіў бадай што ўсіх міжнародных удзельнікаў сустрэчы, — у Беларусі членствам у прафсаюзе ахоплены 95% студэнтаў ВНУ.

— Мы запрасілі да сябе гасцей, каб паказаць, як працуем і як жывём, нікому нічога пры гэтым не навязваючы. У Еўропе прафсаюзны рух — магутная сіла, але наш вопыт працы менавіта з моладдзю здаўся многім цікавым. Кожны чацвёрты член Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі — студэнт, — падкрэслівае **старшыня Цэнтральнага камітэта Аляксандр БОЙКА.** — У чым наш сакрэт? Напэўна, у актуальнасці для новых пакаленняў... Моладзі ўласцівая мабільнасць, ініцыятыўнасць, успрымальнасць да інавацыйных змен, здольнасць супрацьстаяць сучасным выклікам. Таму мы працуем пад дэвізам «Арганізацыю павінны бачыць». Пры Беларускім прафсаюзе работнікаў адукацыі і навукі створаны Маладзёжны савет, які акумулюе перспектыўныя ідэі і прапановы па рэалізацыі маладзёжнай палітыкі і агучвае праблемы навучэнскай і працоўнай моладзі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# КАМАНДА НА КОЛАХ,

## ЦІ Ў РЭЙС З НАЙЛЕПШАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ БРЫГАДАЙ

**...Апоўдні ў суботу за некалькі соцень метраў ад чыгуначнай станцыі «Магілёў-1» ідзе звычайна нябачная для пасажыраў работа: на вагонным участку завяршаецца падрыхтоўка рэйса па маршруце Магілёў—Львоў. Састаў мыюць вадой, тэхнікі аглядаюць хадавую частку, у вагоны загружаюць свежую бялізну, прадукты харчавання. Тым часам у адным з «плацкартаў» начальнік пасажырскага цягніка Алеся РАБЫЧЫНА праводзіць планёрку з маладзёжнай цягніковай брыгадай, якую зусім нядаўна прызналі найлепшай у краіне. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» праехалі па маршруце разам з ёй і распыталі пераможцаў пра нюансы прафесіі.**

### Калі вагоны яшчэ пустыя

«Як самаадчуванне? Як прайшлі выхадныя? Не забудзьцеся праверыць тэмпературу ў вагонах, на кожнай станцыі аглядайце салон на наяўнасць пабочных прадметаў», — настройвае праваднікоў на працоўны лад начальнік цягніка. Планёрка — працэдура абавязковая. Трэба разам з камісіяй праверыць гатоўнасць вагонаў, ці адпавядае форма адзення патрабаванням, даведацца пра стан здароўя праваднікоў. Нагадаць падначаленым пра абавязкі ніколі не будзе лішнім.

Пасля кароткага інструктажу і пытанняў праваднікі разыходзяцца па сваіх вагонах. Афарміць вітрыны са спажывецкімі таварамі, запоўніць дакументы — усё гэта трэба зрабіць загадзя.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Надзеі БУЖАН.

Падчас планёркі адзіныя пасажыры плацкартнага вагона — работнікі брыгады.

# У ЧЫМ ЯГО САКРЭТ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Прафсаюз адукацыі фактычна суправаджае студэнцкую моладзь з моманту яе паступлення ва ўніверсітэт і да атрымання першага працоўнага месца. А педагогі застаюцца пад нашым крылом і далей. Моладзі прысвечаны цэлы раздзел у пагадненні паміж Міністэрствам адукацыі і галіновым прафсаюзам. Ён, як скарбонка, папаўняецца штогод усё новымі і новымі нормамі.

Студэнцкі прафсаюз — унікальная арганізацыя, якая дзейнічае ў інтарэсах студэнтаў і мае магчымасць гаварыць на роўных як з кіраўніцтвам універсітэта, так і са студэнтамі. А яго правы і паўнамоцтвы нарматыўна ўрэгуляваныя ў пагадненнях з установамі адукацыі.

— Фактычна ніводнае пытанне, якое датычыцца студэнтаў, не вырашаецца без уліку меркавання студэнцкага прафкама, — пацвярджае **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў Белдзяржуніверсітэта Вольга ЛОКЦЕВА.** — Нашы прадстаўнікі ўваходзяць ва ўсе ўніверсітэцкія камісіі, дзейнасць якіх закранае пытанні арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу і стыпендыяльнага забеспячэння, сацыяльныя і жыллёва-бытавыя пытанні. Мы маніторым работу пунктаў грамадскага харчавання, умовы пражывання студэнтаў. Удзельнічаем у распрацоўцы правілаў унутранага распарадку ў інтэрнатах, палажэнняў аб засяленні студэнтаў у інтэрнаты, у размеркаванні месцаў. Адлічэнне навучэнцаў — членаў галіновага прафсаюза ці прыцягненне іх да дысцыплінарнай адказнасці таксама не дапускаецца без узгаднення з прафкамам студэнтаў...

На першы погляд, незразумела, навошта ўзгадняць з прафкамам расклад заняткаў? Тым не менш там, дзе ён узгадняецца, незадаволеных раскладам менш, бо дзейнічае рэальны механізм уліку інтарэсаў студэнтаў. А ці патрэбныя працяглыя перапынкі паміж заняткамі для арганізацыі харчавання? Гэта таксама прафсаюзнае пытанне. Бяруцца пад увагу і якасць гандлёвага абслугоўвання, і асартымент у гандлёвых кропках і пунктах харчавання, і рэжым іх працы — каб яны заставаліся даступнымі ў тым ліку для студэнтаў, якія вучацца ў другую змену. Прыкладна раз у месяц студэнцкі прафкам сустракаецца з адміністрацыяй універсітэта, каб агучыць праблемныя пытанні, што ўзнімаюцца студэнтамі.



Падчас III Мінскага маладзёжнага фестывалю педагагічных ідэй і рашэнняў настаўнікі прапанавалі пачаставацца спагецi з праліўнога дажджу, дэсертам «11 гадоў вучыш, а ўсё роўна нічога не памятаю» і адбіўной «Слёзы настаўніка».

Кожны першакурснік, які прыехаў вучыцца ў Мінск з іншага горада, скажа вам, што паступіць у сталічную ВНУ — толькі палова справы. Абсалютна шчаслівым чалавекам можна адчуць сябе толькі ў тым выпадку, калі атрымаеш у студэнцкім інтэрнаце дах над галавой. Асабліва калі табе пашанцуе трапіць у Студэнцкую вёску... Дарэчы, менавіта студэнтам БДУ пашчасціла першымі засяліцца туды. Сёння забяспечанасць месцамі ў студэнцкіх інтэрнатах (а іх у Белдзяржуніверсітэце дзевяць) дасягае амаль 80 працэнтаў. Студэнцкая вёска сёння — гэта восем інтэрнатаў з сучаснай кватэрнай планіроўкай (сваёй кухняй, санвузлом і душавой), спартыўны комплекс «Лядовы каток», стадыён, яслі-сад «Крошкін дом» на 75 месцаў, філіял 33-й студэнцкай паліклінікі, бясплатнае стаматалагічнае аддзяленне... Прычым цэны за пражыванне ў студэнцкіх інтэрнатах вельмі дэмакратычныя: у інтэрнатах першай катэгорыі плата за пражыванне складае для студэнтаў ВНУ ўсяго 1,2 базавай велічыні. Да таго ж аднолькавую суму плацяць як студэнты бюджэтнай формы навучання, так і студэнты-платнікі. Калі браць прыклады іншых краін, то ў Грузіі ўсе інтэрнаты ВНУ аддадзены ў камунальны фонд. У Літве інтэрнаты ўвогуле не запоўнены, паколькі там ніхто не хоча плаціць 100% за камунальныя паслугі і студэнту больш выгадна здымаць кватэру. Толькі адзін штрых: **у 2008 годзе забяспечанасць жыллём студэнтаў была выключана з сацыяльных стандартаў Балонскага працэсу...**

## СТЫМУЛЫ ДЛЯ МАЛАДЫХ ПЕДАГОГАЎ

Многіх замежных гасцей зацікавіў вопыт падтрымкі маладых педагогаў, які прэзентавала **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса ВОЛКАВА.**

Штогод у армію сталічных педагогаў уліваецца ад 700 да 800 выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў. Але праблема іх замацавання на першым працоўным месцы па-ранейшаму актуальная. Няхай яна і не стаіць так востра, як яшчэ тры-чатыры гады таму, калі ў галіне заставаліся толькі 44—45% ад агульнай колькасці (сёння гэты паказчык дасягае 60 працэнтаў), тым не менш далёка не ўсе выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў звязваюць сваю будучыню са школай. Нехта спрабуе пасля заканчэння адпрацоўкі па размеркаванні самарэалізавацца ў тых сферах, дзе плацяць больш, дзе працоўны дзень строга рэгламентаваны, а выхадныя дні можна прысвяціць уласнай сям'і...

— Пытанняў у маладых спецыялістаў, якія прыступаюць да працы, заўсёды ўзнікае шмат, — канстатуе Ларыса Волкава. — Напрыклад, усіх без выключэння цікавіць, як фарміруецца тарыфная стаўка? Ад якіх фактараў залежыць іх заработная плата? Ці можна паўплываць на яе памер? Таму спецыялістамі нашай сацыяльна-эканамічнай службы быў распрацаваны ўніверсальны аўтаматычны анлайн-разлік стаўкі (акладу) для асобных груп работнікаў устаноў адукацыі сталіцы. **Яго можна знайсці на сайце гаркама прафсаюза (http://profobraz.by).** Пры распрацоўцы мы пастараліся ўлічыць найбольш частыя пытанні і вострыя моманты, звязаныя з налічэннем заробку. Кожны малады спецыяліст можа зайсці, унесці свае індывідуальныя звесткі і пракантраляваць, ці правільна яму налічваецца заробак. Калі разлікі не супадаюць, педагогі тэлефануюць нам, просяць дапамагчы разабрацца, хто і дзе дапусціў памылку. Больш за тое, з бухгалтэрый нам таксама тэлефануюць, каб праверыць дакладнасць сваіх разлікаў...

Трэба заўважыць, што **ў сталіцы ўстаноўлены штомесячныя даплаты маладым спецыялістам у памеры адной базавай велічыні на працягу двух гадоў пасля заканчэння тэрміну працы па размеркаванні.** Пры заключэнні кантрактаў для маладых спецыялістаў прадугледжаны заахвочвальныя дадатковыя дні адпачынку.

Калі ж наймальнік «забывае» пра тыя ці іншыя выплаты, напрыклад пра «пад'ёмныя» маладым спецыялістам і выплаты спецыялістам, якія прыбылі на працу ў Мінск з іншай мясцовасці, у справу ўмешваюцца прафсаюзы...

Даволі востра стаіць для маладых педагогаў і праблема з жыллём. У Мінску пакуль дзейнічае толькі адзін інтэрнат для маладых педагогаў, прычым толькі для тых, хто яшчэ не мае сям'і. Але па даручэнні старшыні гарвыканкама месцы для педагогаў могуць выдзяляцца ў інтэрнатах прадпрыемстваў-шэфаў. Зараз вядуцца перамовы пра будаўніцтва ў сталіцы жылога дома для педагогаў. «Улады нас чуюць і шукаюць шляхі, каб вырашыць гэту праблему», — запэўнівае Ларыса Волкава.

***Для даведкі:*** *Еўрапейскі камітэт прафсаюзаў адукацыі з'яўляецца рэгіянальнай структурай Інтэрнацыянала адукацыі (глабальнай федэрацыі прафсаюзаў настаўнікаў і работнікаў сістэмы адукацыі) і прадстаўляе на гэты момант інтарэсы 11 мільёнаў работнікаў дашкольнай, агульнай сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, прафесійнай і вышэйшай адукацыі з 49 краін.*

Традыцыйнымі сталі і сустрэчы спецыялістаў прафсаюза восенню з маладымі педагогамі «Ці лёгка быць маладым?», падчас якіх апошнім тлумачаць, як правільна павінны быць аформлены працоўныя адносіны, расказваюць аб правах, абавязках і гарантыях для маладых спецыялістаў, умовах атрымання кваліфікацыйнай катэгорыі, ад якой таксама залежыць заробак.

Не так даўно з падачы Маладзёжнага савета Мінскай гарадской арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі вырашылася пытанне аб адтэрміноўцы ад службы ў арміі для маладых выкладчыкаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі...

Добрым спосабам падтрымаць настаўнікаў-пачаткоўцаў у сталіцы лічаць прафесійныя конкурсы педагагічнага майстэрства, бо іх пераможцы маюць права на пазачарговае атрыманне кваліфікацыйнай катэгорыі. У маладых педагогаў у горадзе ёсць шмат магчымасцяў, каб сябе праявіць. Адна з іх — штогадовы конкурс «Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі», дзе для старшакурснікаў педагагічных спецыяльнасцяў прадугледжана намінацыя «Педагагічны дэбют», а для педагогаў са стажам працы не больш як тры гады — намінацыя «Мы — маладыя». Да таго ж такія конкурсы ўплываюць як на якасць адукацыі, так і на імідж педагогаў у грамадстве.

Падчас асенніх канікул у гарадскім адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Лідар» пад Мінскам праходзяць традыцыйныя адкрытыя Мінскі маладзёжны фестываль педагагічных ідэй і рашэнняў. Патрабаванняў да мінімальнага прафесійнага стажу на фестывалі не вызначана, таму стаць яго ўдзельнікамі могуць і зусім юныя педагогі з двухмесячным вопытам работы, якія толькі-толькі прыступілі да яе.



Святкаванне Масленіцы — адзін з праектаў прафкама БДУ. Рэктар Белдзяржуніверсітэта Сяргей Абламейка пячэ бліны для пераможцаў конкурсаў...

## ПАВАЖАНАЯ ПРАФЕСІЯ... У ФІНЛЯНДЫІ

**Дырэктар Еўрапейскага камітэта прафсаюзаў адукацыі С'юзан ФЛОКЕН** падкрэслівае: «Адукацыя — гэта зона нацыянальнай адказнасці, а шырокія правы педработнікаў і асяроддзе навучання — ключ да якаснай адукацыі. Дзейнасць прафсаюзаў заўсёды была своеасаблівым выклікам, асабліва на фоне скарачэння бюджэтаў на адукацыю».

Па словах С'юзан, амаль што ва ўсіх еўрапейскіх краінах прафесія настаўніка перастала быць прыцягальнай. Выдаткі на сферу адукацыі падаюць, адпаведна зніжаецца і ўзровень заробкаў. Педагогі адчуваюць моцны ціск з боку бацькоў сваіх выхаванцаў. Шмат часу ім даводзіцца траціць на падрыхтоўку да заняткаў. Мужчыны ў пачатковай і сярэдняй школе становяцца выключэннем. Гэта таксама адно з наступстваў зніжэння прэстыжу ў грамадстве прафесіі педагога. Калі не прапанаваць мужчыну добрую зарплату, то ён будзе шукаць спосабы для сваёй самарэалізацыі ў іншым месцы. Крыху больш мужчын працуе ў вышэйшай школе, а таксама ў кіраўніцкай сферы, дзе больш высокі ўзровень заробкаў. «Мы падтрымліваем ідэю, што выкладанне ў школе — гэта і мужчынская прафесія, — кажа С'юзан Флокен, — арганізуем мерапрыемствы, якія павінны прыцягнуць мужчын у адукацыйную сферу. На парадку дня стаіць таксама павелічэнне колькасці жанчын, што задзейнічаны на кіраўніцкіх пасадах».

Фінляндыя — адна з нешматлікіх еўрапейскіх краін, дзе моладзь ахвотна ідзе ў педагогіку. Пры адборы будучых спецыялістаў там звяртаюць увагу не толькі на акадэмічную паспяховасць прэтэндэнтаў, але і на іх маральна-псіхалагічныя якасці, без якіх педагог не можа адбыцца. Перад прыняццем ва ўніверсітэт усе будучыя педагогі праходзяць спецыяльнае інтэрв'ю, падчас якога высвятляецца іх гатоўнасць навучацца, крытычна мысліць, аперыраваць інфармацыяй, матывацыя да настаўніцкай работы, стаўленне да дзяцей: як чалавек праявіць сябе ў той ці іншай сітуацыі, як ён будзе рэагаваць на магчымую крытыку з боку навучэнцаў ці іх бацькоў, як будзе паводзіць сябе з так званымі «цяжкімі» вучнямі. Дарэчы, толькі 8 працэнтаў найлепшых выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў становяцца ў выніку педагогамі — перш, чым трапіць на педагагічную пасаду, іх чакае сур'ёзны конкурс. У Фінляндыі педагогі лічацца адным з самых адукаваных, прафесія настаўніка — адной з самых паважаных і запатрабаваных, а прадстаўніцтва мужчын складае 40—50 працэнтаў ад агульнай колькасці педагогаў...

Клуб «Залатыя рукі»

# Сукенка — за дзевяць гадзін

**2 залатыя, 21 сярэбраны і 6 бронзавых медалёў заваявала беларуская зборная ў фінале першага адкрытага Еўразійскага чэмпіянату, які прайшоў у рамках V Нацыянальнага чэмпіянату «Маладыя прафесіяналы» ў Расіі.**

Рэспубліканскую каманду «WorldSkills Беларусь» прадстаўлялі навучэнцы каледжаў, студэнты ўніверсітэтаў і маладыя кваліфікаваныя рабочыя ва ўзросце да 22 гадоў з розных рэгіёнаў краіны: Мінска, Гродна, Віцебска, Магілёва, Гомеля, Рагачова, Брэста, Кобрына — усяго 35 чалавек.

Залаты медаль у кампетэнцыі «Тэхналогія моды» заваявала ў Краснадары Вольга Кушнер, навучэнка Гродзенскага каледжа тэхнікі, тэхналогіі і дызайну. Свае навыкі і ўменні дзяўчына дэманстравала на працягу трох дзён. Для пачатку канкурсантам было прапанавана за восем гадзін вырабіць камізэльку на падкладцы, а пасля майстэрскага выканання задання дэкарыраваць сваю работу матэрыяламі з «тайнай» каробкі. Таксама ў рамках конкурсу малады дызайнер распрацоўвала эскізы сукенак і муляжным метадам дэкарыравала прапанаваную мадэль са складанай драпіроўкай. А яшчэ за дзевяць гадзін яна змадэлявала, раскроіла і пашыла сукенку.

У кастрычніку Вольга прадставіць нашу краіну на сусветным чэмпіянаце WorldSkills у Абу-Дабі. Як і яшчэ адзін уладальнік «золата» — Іван Скорб, студэнт БДТУ, які перамог у кампетэнцыі «Вытворчасць мэблі».

Конкурс WorldSkills — гэта своеасаблівыя алімпійскія гульні па розных прафесіях, якія праводзяцца кожныя два гады на працягу вось ужо 60 гадоў. У руху WSI у цяперашні час удзельнічаюць 76 краін, якія ахопліваюць больш як 70 працэнтаў насельніцтва зямнога шара. Мэта WorldSkills — папулярызацыя рабочых прафесій у сучасным грамадстве і павышэнне іх прывабнасці для моладзі.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Свой выбар*

# АРХІТЭКТАР НА ТЫДЗЕНЬ

## Новая анлайн-платформа дазволіць дзецям папрактыкавацца ў любой прафесіі

**Як школьніку вызначыцца з будучай прафесіяй? Даверыцца меркаванню сяброў, маніторыць прахадныя балы на розныя спецыяльнасці або змірыцца з выбарам бацькоў? Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта распрацавалі анлайн-платформу CanBe, якая дазволіць паспрабаваць сябе ў любой прафесіі.**

У камандзе — шэсць чалавек: Ілья Мельнік, Алена Давыдчык, Уладзімір і Цімафей Квачы, Максім Масарноўскі і Сяргей Каравай. Усе з факультэта сацыякультурных камунікацый (спецыяльнасць «Прыкладная інфарматыка. Вэб-праграмаванне і камп'ютарны дызайн»).

Чаму ўзнікла ідэя менавіта такога праекта? Ёсць інфармацыя, што кожны другі беларус расчараваны ў атрыманай ім спецыяльнасці. Гэта звязана з тым, што выбар будучай прафесіі выпадае на падлеткавы ўзрост і засноўваецца пераважна на колькасці нулёў у заробку і грамадскай думцы. Школьнікі робяць важны крок у жыцці не заўсёды асэнсавана.

Распрацоўшчыкі праекта па сабе ведаюць, як няпроста вызначыцца з будучым месцам вучобы і працы.

— Я выбірала хутчэй не прафесію, а спецыяльнасць у ВНУ, — кажа Алена. — У гэтым і заключаецца праблема. На пытанне «Кім ты хочаш быць?» я не магла даць канкрэтны адказ. Выбар профілю «фізмат» быў зроблены яшчэ ў 9-м класе, бо з фізікай і матэматыкай у мяне было ўсё добра. Са спецыяльнасцяў, дзе патрабаваліся гэтыя прадметы, шукала тую, на якой будзе прысутнічаць хоць крыху творчасці.

Некаторыя з членаў каманды падчас вучобы зразумелі, што хочуць развівацца ў іншай сферы. Напрыклад, Ілья, якому ў школе лёгка давалася інфарматыка, збіраецца працаваць не праграмістам, а відэографам, а Сяргей — падацца ў маркетынг.

Са сваёй ідэяй студэнты вырашылі паўдзельнічаць у хакатоне сацыяльных праектаў проста з любові да такіх мерапрыемстваў і спартыўнага інтарэсу (хакатон — гэта «марафон розумаў», дзе спецыялісты з розных сфер разам працуюць над рашэннем нейкай праблемы). А ў выніку сталі фіналістамі конкурсу Social Weekend і атрымалі спонсарскую дапамогу — дзве тысячы рублёў.



Каманда праекта.

Ідэя CanBe заключаецца ў правядзенні тэматычных тыдняў і знаёмстве з нюансамі пэўнай прафесіі. Карыстальнік анлайн-платформы зможа пачытаць інфармацыю аб спецыяльнасці, паглядзець відэаролік і нават адправіцца ў віртуальную экскурсію, каб паглыбіцца ў рабочую атмасферу. Плюс школьнікам прапануюць наведаць практычныя заняткі — правесці два дні на прадпрыемстве.

У сакавіку прайшлі пробныя заняткі па прафесіі «крэатыўны дырэктар». А першы тэматычны тыдзень запланаваны на 12—18 чэрвеня. Падчас яго падлеткаў пазнаёмяць з абавязкамі маркетолага. А на выхадныя (17—18 чэрвеня) запросяць папрактыкавацца ў мастацтве прасоўвання тавараў у адну з беларускіх абутковых сетак.

У найбліжэйшы час будуць арганізаваны таксама тэматычныя тыдні, прысвечаныя прафесіям журналіста і HR-спецыяліста. У планах — эканаміст, прадзюсар, гукарэжысёр, архітэктар, спецыяліст па нейронных сетках, футуролаг, канструктар робатаў.


На першых занятках падлеткі спрабавалі сябе ў ролі крэатыўнага дырэктара.

— Цяпер мы шукаем тых, хто гатовы правесці практычныя заняткі і падзяліцца ведамі і вопытам са школьнікамі, — кажуць студэнты.

Свой праект яны пачалі рухаць як валанцёры, але ў будучым спадзяюцца яго манетызаваць. Зарабляць, напрыклад, на рэкламе адукацыйных рэсурсаў, шукаць партнёраў. Некаторыя паслугі анлайн-платформы (практычныя заняткі і карту шляхоў развіцця прафесій) зробяць платнымі. Пры гэтым кошт будзе супастаўляльны з паходам у тэатр ці кавярню.

Паўнацэнны запуск сайта прызначаны на 1 верасня.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*



З Наталляй Лубнеўскай

# МАРАФОН ПАХУДЗЕННЯ

**Ёсць у беларусаў традыцыя — худзець да лета. Абанементы на фітнес у гэты час разлятаюцца, як гарачыя піражкі ў студэнцкім буфеце, а яблыкі і агуркі становяцца самымі запатрабаванымі прадуктамі. А вы не задумваліся: чаму худзець даводзіцца да кожнага лета? Чаму нельга гэта зрабіць раз і назаўсёды?**

Знаёмы нядаўна падзяліўся разважаннямі. Ёсць дзве мадэлі паводзінаў: заходняя (папулярная ў нас), дзе галоўнае — мэта, і ўсходняя, дзе важны сам працэс. Дык вось калі справа датычыцца прыгожага цела, лепш прытрымлівацца апошняй. Статыстыка толькі пацвярджае гэту тэорыю. Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця нядаўна назвала краіны з самай вялікай колькасцю жыхароў з атлусценнем. Лідарам рэйтынгу сталі ЗША: 38 працэнтаў амерыканцаў маюць праблемы з залішняй вагай. А найменшы працэнт (усяго толькі 3,7) грамадзян з атлусценнем — у Японіі.

Краіна ўзыходзячага сонца ўвогуле наватар у сферы фітнесу. Пра метад «табата» чулі? Заняткі па гэтай методыцы доўжацца ўсяго чатыры хвіліны. А яшчэ ў Японіі ёсць фітнес для... немаўлят (кліентам можна стаць ужо ў паўтарамесячным узросце).

З іншага боку, не той клімат у нас, каб дазволіць сабе ўвесь год быць худым. (Жарт у тэму: «Паглядзім яшчэ, што за лета. Можа, не варта худзець».) Зімой без лішніх кілаграмаў у марозе не вытрымаеш. Дый дыетолагі раяць у халодны час года ўключаць у меню сытныя і тлустыя стравы. Можа, не ў такой колькасці, як мы гэта робім, але... А выйсці на прабежку ў дождж і вецер хто адважыцца? Гэта вам не сонечнае марское ўзбярэжжа. Жылі б мы каля акіяна, таксама, магчыма, кожную раніцу пачыналі б з фізкультуры.

А вось як толькі пацяплела, самы час прыгадаць, што актыўны лад жыцця — гэта не толькі кароткія перабежкі ад канапы да халадзільніка і назад. Тым больш магчымасцяў вакол нас — безліч. Варкаўт спрабавалі? У парку імя Марата Казея ў Мінску якраз амаль штодзень праводзяць трэніроўкі пад кіраўніцтвам інструктараў. У будныя дні (акрамя панядзелка і серады) з 18.00, у выхадныя — з 15.00.

Бясплатныя трэніроўкі прапануе міжнародная фітнес-супольнасць Nike+ Training Club. Аматарам спорту чакаюць па нядзелях. Адзінае — патрэбна папярэдняя рэгістрацыя. Каб не «праспаць» яе, лепш падпісацца на навіны супольнасці: месцы ў зале расхопліваюць за 10 хвілін!

У трэнажорцы летам, дарэчы, ёсць свой плюс. Будзе, дзе памыцца, калі адключаць гарачую ваду. А што, добрая матывацыя — два тыдні без гарачай вады абяцаюць стаць самымі спартыўнымі ў годзе.

Калі слаўвя трэніроўкі і бег — гэта не ваша, а быць зграбным хочацца, можна проста часцей адпраўляцца на шпацыр. Каб заставацца здаровым, у дзень рэкамендуюць праходзіць 10 тысяч крокаў. У сярэднім гэта каля пяці-сямі кіламетраў. Не абавязкова праадольваць іх за раз. У інтэрнэце мужчына падзяліўся вынікамі свайго эксперымента. Спачатку ён правёў працоўны дзень з мінімумам рухаў: рэдкія паходы да кабінета начальніка, ліфт, вечар за камп'ютарам. У выніку — пяць тысяч крокаў. На другі дзень ён дадаў зарадку, шпацыр у абед і перад сном, а ліфт замяніў прыступкамі. Усяго толькі. За суткі атрымалася 11 тысяч крокаў. Так што быць актыўным кожны дзень цалкам рэальна.

Ёсць яшчэ добрая навіна для дзяўчат, якія мараць сесці на шпагат. Лета — ідэальны час для заняткаў стрэтчынгам. Бо ў цёплы час (і пасля добрага адпачынку) мышцы расцягваюцца лепш. Удзяліце расцяжцы хоць бы 10 хвілін тры разы на тыдзень — і ў канцы жніўня адчуеце сябе гімнасткай.

Калі ж да гэтага лета пахудзець не паспелі — не адчайвайцеся. Далучыцеся да «марафона» ў наступным годзе. Паверце, удзельнікаў меней не стане. Бо ўсходняя філасофія — добра, але свае традыцыі мацнейшыя.

*Ведай нашых!*

# ДВА «ВЫСТРАЛЫ» БЕЗ ПРОМАХАЎ

**Праект «Смартфон новага пакалення AirPhone» адзінаццацікласніка са слуцкай сярэдняй школы №11 Уладзіслава Гадалава заваяваў трэцяе месца на міжнародным конкурсе навукова-даследчых праектаў для школьнікаў Intel International Science and Engineering Fair 2017 у Лос-Анджэлесе.**

Каманда юных даследчыкаў з Беларусі — пераможцаў конкурсу Belarus Science and Engineering Fair — пяты раз прывозіць прызы і дыпломы з гэтага прэстыжнага конкурсу. Сёлета ўдзел у інтэлектуальных спаборніцтвах прынялі больш за 1 700 школьнікаў з 78 краін свету. Прызавы фонд конкурсу складае не менш як 3 мільёны долараў. На сусветным фінале праекты ацэньваюць больш як 1200 членаў журы, прызнаных прафесіяналаў у сваіх сферах, у тым ліку і лаўрэаты Нобелеўскай прэміі, а таксама вядучыя супрацоўнікі кампаніі Intel і многіх іншых кампаній і агенцтваў. Колькасць наведвальнікаў конкурсу перавышае 10 тысяч чалавек штогод.




Уладзіслаў прывёз у ЗША смартфон новага пакалення AirPhone, галоўная перавага якога заключаецца ў рабочае прылады праз аддалены доступ, што стварае высокую ступень бяспекі і адкрывае новыя ўнікальныя магчымасці. Свой праект ён рыхтаваў пад кіраўніцтвам школьнага настаўніка інфарматыкі Уладзіміра Жука. Акрамя дыплома 3-й ступені, работа хлопца была адзначана таксама спецыяльным прызам карпарацыі Oracle — найбуйнейшага вытворцы праграмнага забеспячэння ў свеце, пастаўшчыка сервернага абсталявання. Два гады таму Уладзіслаў таксама быў фіналістам Intel ISEF, а яго праект «Сістэма бяспекі Artemis Web Security» атрымаў спецыяльны прыз ад найбуйнейшага ў свеце рэгістратара даменных імёнаў GoDaddy.

Беларусь у Лос-Анджэлесе прадстаўляла таксама вучаніца 10-га класа гімназіі №1 з Жодзіна Аляксандра Кахавец. Дзяўчына прэзентавала журы сваё даследаванне «Сумнік як перспектыўная сыравіна для нацыянальнай фармакалогіі і энергетыкі».

Арганізатарамі конкурсу Belarus Science and Engineering Fair выступаюць Парк высокіх тэхналогій, упраўленне адукацыі Мінскага аблвыканкама, Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі і карпарацыя Intel. У 2017 годзе на рэспубліканскі конкурс было прадстаўлена больш як 137 навуковых і інжынерных работ навучэнцаў з усіх рэгіёнаў Беларусі. У фінал выйшлі 48 работ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Рух ад сэрца*

# ДАПАМОГА — ТОЕ, ШТО ЗАЎСЁДЫ МАЕ СЭНС

**З 2011 года ў краіне працуе краўдфандынгавая пляцоўка з сімвалічнай назвай «Мае Сэнс». Галоўная мэта, з якой яна стваралася, — дапамагаць збіраць сродкі на рэалізацыю карысных для грамадства спраў. А самая цікавая частка задумы — той фармат, у якім праводзіцца пошук грошай.**

Гэта адбываецца праз аўкцыён сустрэч. Любы чалавек можа прыдумаць цікавую тэму для яго і прапанаваць у агульным доступе. А ў астатніх ёсць магчымасць рабіць стаўкі на такі імправізаваны лот. Стваральнік сустрэчы таксама загадзя выбірае той сацыяльны праект, у дапамогу якому будуць пераведзены сабраныя грашовыя сродкі. Як і на любым аўкцыёне, пераможцам становіцца той, хто прапануе найбольшую суму за адведзены час. Да 80 працэнтаў грошай пераводзіцца таму праекту, які вырашыў падтрымаць арганізатар сустрэчы. А пераможца (ён жа пакупнік лота) атрымлівае абяцаны прыз. Фармат сустрэчы можа быць любы: ад класічнага «пачастую гарбатай ці кавай» да самых неспадзяваных і арыгінальных прапаноў накшталт «індывідуальны занятак па тэнісе», «пачастунак чырвонай і чорнай ікрой», «класічны масаж» і мноства іншых. Дзякуючы такому крэатыўнаму падыходу дапамагчы можа кожны, нават той, у каго для гэтага не хапае сродкаў, але ёсць вольны час.


Фота Лаўры РУЖАНКОВА.

**«Міс Мае Сэнс» Наталля Шумчэня з Аляксандрай Касценкай.**

На сайце пляцоўкі maesens.by ўжо зарэгістравана больш як 85 тысяч карыстальнікаў, якія ахвяруюць свой вольны час ці грошы на добрую справу. Тут жа публікуецца справаздача: калі, куды і колькі грошай было пераведзена. Унесці ўклад вельмі проста: трэба азнаёміцца і пагадзіцца з правіламі, затым хуткая рэгістрацыя на сайце, запоўненне маленькай анкеты — і вы ўжо карыстальнік.

Мы пацікавіліся, што за людзі працуюць над падтрымкай гэтага праекта, і пазнаёміліся з адной з супрацоўніц пляцоўкі «Мае Сэнс» — Аляксандрай Касценка, якая пагадзілася адказаць на некалькі пытанняў.

***— Раскажыце, як вы трапілі сюды?***

— Раней я працавала трэнерам-адміністратарам нацыянальнай каманды краіны па пляжным валейболе. Сама работа мне падабалася, але кожны дзень не пакідала думка, што я магу рабіць нешта больш важнае і знакавае. Аднойчы мне патэлефанавала знаёмая і прапанавала паспрабаваць прайсці тут гутарку на працу, што я паспяхова і зрабіла праз некалькі дзён. З 1 красавіка 2016 года праект «Мае Сэнс» — мая асноўная і адзіная работа, якая прыносіць радасць кожны дзень. Я жыву ёй і прыходжу сюды з вялікім задавальненнем. А сама ідэя таго, што я працую з дабрачыннымі сацыяльна накіраванымі праектамі, натхняе з першага дня. Цяпер мой дэвіз «Маленькай дапамогі не бывае», бо кожны нават невялікі ўнёсак вельмі каштоўны.

***— Вы самі выстаўлялі сустрэчы на аўкцыён?***

— Напачатку было боязна: невядома яшчэ, хто як успрыме тваю ідэю. Першай я вырашыла прапанаваць сустрэчу, звязаную з маім хобі: сумесную прабежку з індывідуальнымі рэкамендацыямі па бегу. Сустрэча прадалася за 50 рублёў. А потым ужо было зусім не страшна. Мне здаецца, што такі механізм збору сродкаў — гэта проста выдатная ідэя. У цябе не заўсёды ёсць грошы, каб дапамагчы, але часта ёсць час. І, калі ты бачыш, што гэты механізм працуе, разумееш, наколькі рэальна і проста дапамагаць.

***— Раскажыце пра самы кранальны асабіста для вас момант, звязаны з праектам...***

— Іх многа: малюнкі дзяцей, якім мы дапамаглі, іх лісты ў падзяку, шчаслівыя твары бацькоў і многае іншае. Але, ведаеце, самы, мабыць, кранальны здарыўся не так даўно. У нашым конкурсе ўнутранай прыгажосці «Міс Мае Сэнс», што праходзіў напрыканцы 2016 года, выйграла дзяўчына з асаблівасцямі развіцця Наталля Шумчэня. Момант, калі яна на цырымоніі ўзнагароджання выехала на сцэну, быў вельмі для мяне кранальны.

Ці мае сэнс удзельнічаць у дабрачынным руху, кожны вырашае для сябе асабіста. Але, як сказала сама Аляксандра, «шчырае імкненне дапамагаць дорыць пачуццё, з якім табе святлей быць сярод людзей».

**Дар'я АРЭФ'ЕВА, студэнтка VI курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# КАМАНДА НА КОЛАХ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Састаў тым часам чапляюць да лакаматыва і падаюць на платформу. Члены брыгады апранаюць уніформу і выходзяць сустракаць першых пасажыраў.

Алеся Рабычына ў дзяцінстве марыла стаць урачом, бо хацела дапамагаць людзям. Першую адукацыю атрымала па спецыяльнасці «псіхолаг» у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова. Прыйшла працаваць у санаторый чыгуначнікаў «Дубравенка» педагогам-арганізатарам і выхавацелем. Потым перавялася на Магілёўскі вагонны ўчастак, дзе адвучылася на спецыяльных курсах пры рэзерве праваднікоў. Пасля атрымала вышэйшую адукацыю ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, што ў Гомелі. Сем гадоў таму стала выканаўцам абавязкаў начальніка цягніка — падмяняла калег, якія знаходзіліся на бальнічным ці ў адпачынку. Калі было вырашана стварыць маладзёжную брыгаду для абслугоўвання маршрута Магілёў — Львоў, яе кіраўніком прызначылі Алесю.

**Саставы, якія ідуць па неэлектрыфікаваных участках чыгункі, дагэтуль ацяпляюцца пры дапамозе вугальнай печкі — яе трэба паліць.**

— Я кантралюю ўсё, што адбываецца з саставам падчас руху, — расказвае суразмоўца. — Пры ўзнікненні любых праблем праваднікі і электрамеханік звязваюцца са мной. Асабліва гэта датычыцца пытанняў ад пасажыраў. Я павінна дасканала ведаць усе правілы, каб адразу ж даць адказ са спасылкамі на афіцыйныя дакументы. Ды і па тэхнічнай частцы начальнік павінен быць «падкаваны» ідэальна. Любыя затрымкі ўплываюць на бяспеку руху, таму мне трэба быць у курсе ўсяго, што адбываецца з саставам, хутка рэагаваць на нестандартныя сітуацыі.

## Універсальны праваднік

У хуткім часе старонніх традыцыйна просяць пакінуць вагоны, і састаў адпраўляецца. Праваднікі правяраюць у пасажыраў білеты, запаўняюць паперы, а затым апранаюць фартухі — час прапаноўваць гарбату.


Фота Надзеі БУЖАН.

**Начальнік цягніка Алеся Рабычына.**

— Наша работа — гэта быць майстрам на ўсе рукі, — смяецца **праваднік Марына ЦІБЕКІНА**. — Трэба быць адначасова і прадаўцом, і тэхнікам (разбірацца ва ўстройстве вагона), і медыкам, і апальшчыкам, і прыбіральшчыкам, і трохі псіхолагам. Сама я родам з Крычава, працую на чыгунцы з 18 гадоў, калі скончыла Гомельскі дзяржаўны прафесійны ліцэй чыгуначнага транспарту. Такую прафесію выбрала, бо праваднікамі працавалі мае бацькі і бабуля. У чым галоўная складанасць? Гэта работа з людзьмі, пасажыры трапляюцца розныя. Нехта можа, напрыклад, сесці выпіваць у плацкартным вагоне, што катэгарычна забаронена, і не рэагаваць на заўвагі. У такіх выпадках выклікаем начальніка цягніка. Іншыя не звяртаюць увагі на правілы перасячэння мяжы. Здараецца, іх нават здымаюць пагранічнікі. Адзінае выйсце — шукаць падыходы да кожнага чалавека, хоць часам гэта вельмі цяжка.

— Безумоўна, праца не з лёгкіх, асабліва для дзяўчат, — гаворыць Марына. — Трэба разумець, што за тры дні, якія мы правядзём у камандзіроўцы, нават магчымасці нармальна прыняць душ не будзе. Карыстаемся бойлерам: змешваем гарачую і халодную ваду, каб умыцца. Калі прыязджаем у Львоў, адпачываем у вагонах, бо пакідаць іх нам нельга. Адлучыцца ў горад можна толькі замест адпачынку на сон, калі цябе падмяняюць калегі, ды і тое з дазволу начальніка пасля запісу ў спецыяльным журнале. Але я рада, што выбрала такі шлях. Не паверыце, больш за ўсё люблю ў рабоце момант, калі ёсць вольная хвілінка і можна проста паглядзець у акно, паназіраць за прыродай — за два гады работы мне гэта не надакучыла!



**Марына Цібекіна сцвярджае, што праваднік павінен быць майстрам на ўсе рукі.**

## Вугалёк для печкі

З тым, што работа праваднíка больш падыходзіць мужчынам, цяжка не пагадзіцца. Фізічнай працы тут вельмі шмат. Так, саставы, якія ідуць па неэлектрыфікаваных участках чыгункі, дагэтуль ацяпляюцца пры дапамозе вугальнай печкі — яе трэба паліць. Узімку абавязковая працэдура — збіццё наледзі з падвагоннага абсталявання. Робіцца гэта незалежна ад надвор'я і часу сутак. Але сярод праваднікоў брыгады толькі адзін хлопец — **Яўген КАРНІЛАЎ**. Працаваць сюды ён прыйшоў у 2010 годзе, таксама пасля заканчэння Гомельскага ліцэя. Над будучай прафесіяй доўга не разважаў: магіляўчанін — чыгуначнік ужо ў пятым пакаленні.

— Брыгада ў нас выдатная, да гэтага працаваў на іншых рэйсах, таму мне ёсць з чым параўноўваць, — кажа Яўген. — Увогуле, работа шмат чаго мне дала. На першым месцы — уменне сябе кантраляваць і весці дыялог з самымі рознымі людзьмі. З намі займаецца псіхолаг, які вучыць правільна камунікаваць і вырашаць канфлікты. Усё ж залежыць ад дробязяў — недзе трэба правільна трымаць рукі, недзе прысесці побач, а не стаяць над чалавекам. Гэта моцна дапамагае і па жыцці. Цяжкасці? У асноўным, бытавыя — усе ведаюць, як стамляешся падчас падарожжаў, а для нас гэта штодзённая работа. Хапае і папяровай працы, нават выдача бялізны і продаж гарбаты падлягаюць строгай справаздачнасці.

Па словах хлопца, аб'ём работы залежыць яшчэ і ад сезона. Найбольшая загружанасць у рэйса на навагоднія святы і ў сярэдзіне лета — тады састаў можа складаца амаль з двух дзясяткаў вагонаў, кожны з якіх запоўнены пад завязку. У такіх выпадках пра вольныя хвіліны няма чаго і думаць. Кожнаму з пасажыраў трэба ўдзяліць час, а патрабаванні бываюць самыя розныя...

**«Больш за ўсё люблю ў рабоце момант, калі ёсць вольная хвілінка і можна проста паглядзець у акно, паназіраць за прыродай — за два гады работы мне гэта не надакучыла!»**

На думку Яўгена, брыгада перамагла ў конкурсе, бо «каманда» разам не толькі на рабоце. Па яго словах, супрацоўнікі шмат стасуюцца адно з адным і калі пакідаюць вагоны: ездзяць разам адпачываць у санаторыі, перыядычна выбіраюцца на прыроду. Не забываюцца і на дабрачыннасць. Так, нядаўна ўдзельнікі брыгады наведвалі Дом дзіцяці ў Магілёве, перадавалі выхаванцам падарункі ад чыгуначнікаў.

## Сакрэт у людскасці

У састаў брыгады ўваходзяць начальнік, электрамеханік і праваднікі — усяго 11 чалавек. Свой адбітак на іх работу накладвае міжнародны статус цягніка. Першая адметнасць — працягласць рэйса трое сутак з улікам дня ў Львове, які разлічаны на адпачынак. Пасля гэтага — тры выхадныя, і цыкл паўтараецца. Перасячэнне цягніком мяжы адбіваецца на правілах перавозкі пасажыраў (адрозніваюцца, напрыклад, умовы транспарціроўкі жывёл, ручной паклажы і іншае).

— Чаму менавіта нас прызналі найлепшымі? — перапытвае Алеся Рабычына. — Відаць, абышлі канкурэнтаў па асноўных паказчыках. Кожны квартал мы здаём справаздачу па выніках нашай працы. Там зафіксавана абсалютна ўся інфармацыя пра работу брыгады: колькі падзяк ці скаргаў прывезлі з рэйсаў, колькі грошай зарабілі на продажы тавараў і паслуг, як выконвалі правілы тэхнікі бяспекі і аховы працы, наколькі былі пунктуальнымі і многае іншае. Яшчэ ўлічваецца ўдзел у спартыўных, культурна-масавых мерапрыемствах. А увогуле, мяркую, галоўнае, што нас характарызуе як брыгаду, — гэта чалавечнасць. Яшчэ на першай сустрэчы я ўсім сказала, што працаваць буду толькі з тымі, хто ставіцца да пасажыраў па-людску. Можа, у гэтым і ёсць наш сакрэт.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Магілёў — Мінск.*




# Юнкары, увага!

**Сёння мы працягваем публікацыю найлепшых «проб пяра» нашых юных і маладых няштатных аўтараў, якія паступілі на творчы конкурс. Падвядзенне яго вынікаў — справа найбліжэйшай будучыні, таму ўдзельнікам давядзецца яшчэ крышачку пацярпець і пахваляваацца.**

**Мы ж са свайго боку раім аўтарам не марнаваць час у чаканні, а дасылаць свае творчыя работы ў «Чырвонку. Чырвоную змену» ўжо па-за конкурсам — як звычайныя журналісцкія матэрыялы. Такім чынам няштатнікі, якія збіраюцца паступаць на журфак, і карысны досвед атрымаюць, і ўласнае партфоліа папоўняць. Чакаем вашых «проб пяра»!**

## ЛЮБІМЦЫ ПА ЖЫЦЦІ — КОНІ

**Ноч адступае... Вакол пануе сонная цішыня. Дзьме лёгкі ветрык, ранішні туман сцелецца над зямлёй. Свет замірае, быццам рыхтуецца да цуду. Вось ён, момант, калі загараецца сонца на ўсходзе. Яно ўсё больш выглядае з-за гарызонту. Дзесьці забрахаў сабака, рыпнулі дзверы, загучалі галасы людзей. І вось на золку з'яўляюцца сілуэты коней, якія купаюцца ў возеры...**



Гэтая карціна з дзяцінства стаіць перад вачыма маладой жыхаркі Маладзечна Вікторыі Іванавай. Дзіцячыя ўражанні запалі ў душу, і цяпер яе захапленне — коні, без якіх дзяўчына не ўяўляе свайго жыцця. Нават першым словам, якое яна сказала, было «і-га-га».

Седзячы зімовымі вечарамі каля печы, маленькая Віка з задавальненнем слухала бабуліны аповеды пра маленькіх конікаў. Залівіста смяялася, калі тая казытала босыя ножкі ўнучкі, прыпяваючы: «Кую-кую ножку, паеду ў дарожку. Дарожка крывая, кабылка кульгавая». А потым, калі прыязджалі бацькі, прасіла іх купіць ёй поні. У шостым класе дзяўчынку запісалі ў конную секцыю.

Школьныя гады прайшлі паралельна са спаборніцтвамі па пераадоленні перашкод на конях. Ад моцных фізічных нагрузак жаданне звязаць сваю будучыню з гэтымі жывёламі ў Вікторыі не прапала.

